№№85–86
(2605–2606)

31 мая 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

САЛІДАРНАСЦЬ

Кожнае слова Насці — не толькі боль за Айчыну, але і любоў да яе

Мы, ветэраны вайны, прачыталі ў "Народнай волі" за 20 красавіка г.г. інтэрв'ю Насці Палажанка. Да глыбіні душы ўсхвалявала і ўзрушыла нас шчырая і адкрытая споведзь гэтай самаадданай дзяўчыны, дзе кожнае слова — не толькі боль за Айчыну, але і любоў да яе, і ўсё гэта прасякнута патрыятызмам, высакароднымі памкненнямі. Але ж чаму на гэтым высакародным шляху маладых столькі перашкод?

Шаснаццацігадовая беларуская дзяўчына Насця не марыць аб заморскіх краінах, а хоча жыць нармалёва ў сваёй. Яе мара — паступіць у беларускую навучальную ўстанову, стаць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Гэта ж цудоўна! Такое імкненне можна толькі вітаць і падтрымліваць, а што атрымліваецца на справе? Мы не можам такое ўспрымаць без болю ў душы і маральнага пратэсту. Ці ж за гэта на палях бітвы з фашыстамі мы пралівалі сваю кроў і не шкадавалі самога жыцця?

Давайце ўсе разам зробім усё магчымае для таго, каб жыццё нашых нашчадкаў, нашай моладзі было людскім, а пакуль усё тое, пра што піша абураная Насця, не адпавядае крытэрыям простай чалавечай павагі і прыстойнасці.

Мы рашуча падтрымліваем такіх прадстаўнікоў беларускай моладзі, як Насця Палажанка, і настойліва патрабуем спынення супраць іх усялякага пераследу.

Мікалай БАЛІЦКІ,
Леанід ЗАКУРДАЕЎ,
Мікола МЕЛЬНІКАЎ,
удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

Гродна.

СЛЫШАЛИ?

Лебедько предлагает референдум

Анатолий Лебедько намерен вынести на рассмотрение нового состава Политсовета Объединенных демократических сил предложение об инициировании общенационального референдума по трем вопросам. Это отношение к тотальной отмене социальных гарантий для разных категорий населения, к контрактной системе и строительству атомной электростанции в Беларуси.

"Лукашенко и его окружение утверждают, что в Беларуси супердемократия, и все решает народ. Самое время подтвердить это не словом, а делом", — считает руководитель ОГП. По его словам, если проблема касается миллионов людей, то и процедура ее решения должна учитывать позицию самих граждан Беларуси.

Анатолий Лебедько считает необходимым организовать открытую дискуссию по всем трем вопросам на белорусских телеканалах. Он отметил, что объединенные демократические силы готовы на экспертном уровне изложить свою позицию и свои аргументы, сообщает пресс-служба ОГП.

ВНИМАНИЕ!

Врачи предупреждают...

Чрезмерное использование кондиционеров в жару может быть вредно для здоровья. Такое мнение в беседе с корреспондентом БЕЛТА высказала заместитель начальника управления организации медицинской помощи Министерства здравоохранения Людмила Жилевич.

По ее словам, массовое использование кондиционеров стало одной из причин роста количества обращений граждан в поликлиники с простудными заболеваниями. Так, риск заболеть последними увеличивается, если организм человека постоянно подвергается резким перепадам температур между жарким воздухом на улице и прохладным в помещении.

Помимо этого, нередко белорусы пользуются уже устаревшими кондиционерами, в которых скапливается огромное количество микробов, способных вызвать инфекцию. *"Поэтому любители кондиционеров часто страдают респираторными заболеваниями, у них обостряются хронические болезни, особенно хронические тонзиллиты"*, — отметила Людмила Жилевич.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Гарачы Кангрэс

...Спякота. Нават спецслужбоўцы пахаваліся ў цянёк і здаецца, што ніякай цікавасці да Кангрэса дэмакратычных сіл у афіцыйнай улады няма. Вось толькі аграмадны аўтазак не схаваеш — па іроніі лёсу ён створаны на базе МАЗа, і Кангрэс праходзіць у Палацы культуры Мінскага аўтазавода. "Вам жа купілі аўтобусы з кандыцыянерамі, — шуткуюць дэлегаты Кангрэса з "экіпажам" аўтазака, — што ж вы тут парыцеся?" "Вам таксама аўтазакі спатрэбяцца", — чуецца ў адказ. "Вось так усё жыццё ў аўтазаку і праездзіце..."

Гарачыя дэбаты напярэдадні, гарачае надвор'е, гарачы амаль з першых хвілін Кангрэс.

Дзень першы

Яшчэ не былі сфарміраваны працоўныя органы форуму, як на трыбуну прарваўся Мікалай Статкевіч. *"Я два гады правёў у калоніі, таму маю права на дзве хвіліны"*, — патлумачыў Статкевіч. І запатрабаваў, каб адразу ж былі ўнесены змены ў прапанаваны парадак дня. *"Першым пытаннем павінна быць пытанне аб стратэгіі, бо што мы будзем рабіць, як і з кім — гэта галоўнае. Праект, які выносіцца на галасаванне, — гэта стратэгія страху і стомленасці. Мы прапануўваем альтэрнатыўны варыянт, стратэгію дзеяння, стратэгію, скіраваную на Еўропу, на ўступленне Беларусі ў Еўрасаюз"*.

У зале пачаўся мітынг — прадстаўнікі незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" і іншыя прыхільнікі Аляксандра Мілінкевіча вітаюць Статкевіча, вітаюць Севярынца, выкрыкваюць "Мілінкевіч! Мілінкевіч!". Людзі не чуюць не толькі таго, хто выступае на трыбуне, але і адзін аднаго. На трыбуну выходзіць дэлегат сталага ўзросту і спрабуе нагадаць, што стратэгія ўжо адобрана большасцю галасоў на рэгіянальных сходах. Гаворыць ён па-беларуску, але "Малады фронт" скандзіруе: "Ганьба!", "Пенсія!.."

На трыбуну прарываецца Сяргей Калякін і заклікае прэзідыум і ахову выводзіць з залы тых, хто абражае дэлегатаў. Але і яму крычаць: "Ганьба! Ганьба!.."

За маёй спінай гвалт "Маладога фронту", справа ад мяне аж падскоквае ад выкрыкаў адзін з найбольш актыўных членаў штаба Мілінкевіча Алесь Юркоў, перада мной утрапёна скандзіруе кіраўнік віцебскага штаба адзінага кандыдата Хрыстафор Жаляпаў... *"Што гэта?"* — здзіўлена запытвае Зінаіда Ганчар, якая сядзіць побач. Адказваю: *"Гэта спроба сарваць Кангрэс"*.

Спроба не ўдалася. Справу ў свае рукі ўзяў вопытны Станіслаў Шушкевіч. Не хаваючы таго, што ён падтрымлівае Аляксандра Мілінкевіча, Шушкевіч усё ж такі спыніў гвалт, проста паставіўшы прапанову Статкевіча на галасаванне. Большасцю галасоў было вырашана, што спачатку трэба, каб лідэры прадаставілі справаздачы пра тое, як прайшла мінулая прэзідэнцкая выбарчая кампанія, і якія вывады зроблены з памылак і дасягненняў.

Аляксандр Мілінкевіч адразу назваў кампанію паспяховай, у першую чаргу таму, што было абуджана грамадства. Ён, праўда, прызнаў, што магло быць зроблена больш. *"Але ганьбіць тое, што зроблена, не варта"*, — лічыць Мілінкевіч. Ён фактычна заявіў, што адмаўляецца ад усіх папярэдніх дамоўленасцяў паміж лідэрамі і ад свайго подпісу пад пагадненнем аб тым, што ўсе прызнаюць выніку Кангрэса, якімі б яны ні былі. Мілінкевіч заявіў, што не будзе вылучацца на пасаду сустаршыні Палітсавета, паколькі лічыць такую форму кіравання апазіцыяй неэфектыўнай.

"У апазіцыі глыбокі крызіс, — канстатаваў Мілінкевіч. — *Змаганне за ўладу ў краіне падмянілі змаганнем за ўладу ў апазіцыі"*. Зразумела, што сябе самога былы адзіны кандыдат на ўвазе не меў. Ён за адзінага лідэра, ён за актыўныя дзеянні, ён стварае новы палітычны рух "За свабоду!". *"Ніхто не мае права вета на дзейнасць"*, — папярэдзіў Мілінкевіч усіх сваіх крытыкаў.

Сяргей Калякін трымаў справаздачу як кіраўнік перадвыбарнага штаба. На яго думку, таксама ўсё прайшло добра. Вось толькі высветлілася, што і не ставілася на мэту перамога Мілінкевіча на мінулых выбарах. *"Мы ставілі сваёй мэтай давесці вядомасць Мілінкевіча да 70—75%, а падтрымку — да 25—35%, і такая задача была выканана"*, — заявіў Калякін. Подпісаў за вылучэнне Мілінкевіча на пост прэзідэнта хацелі сабраць мільён, а сабралі 230 тысяч... Усе гады дабіваліся доступу да дзяржаўных СМІ, а праграмныя дакументы кандыдата ў гэтых самых СМІ не надрукавалі — не паспелі па тэрмінах... Адным словам, куды ўжо лепей.

У той жа час трэба адзначыць, што ўпершыню амаль усе выступы камуністаў былі на беларускай мове. Так што ў некаторым сэнсе кампанія была не безвыніковай.

Анатоль Лябедзька як старшыня Нацыянальнага камітэта, які выпрацоўваў усе праграмныя дакументы, нагадаў прысутным пра палітычнае пагадненне аб тым, што самыя спрэчныя пытанні аб лідэрстве і стратэгіі будуць вырашаны на рэгіянальных сходах. Сходы вызначаліся. Яны — за сустаршынства: пяць сустаршыняў — пяць накірункаў дзейнасці, і кожны з лідэраў адказны за свой; кожны будзе трымаць справаздачу за тое, што зроблена. Таму, на яго думку, папрокі ў безадказнасці не маюць пад сабой падстаў. Лябедзька заклікаў спыніць бессэнсоўную дыскусію і выказаў здзіўленне, чаму падчас ранішняга пасяджэння Аляксандр Мілінкевіч не спыніў недастойныя паводзіны сваіх прыхільнікаў.

(Працяг на 2-й стар.)

Фота Вадзіма ПЯСКОВА.

ЗА РЕШЕТКОЙ

О досрочном освобождении Николай Автухович не думает...

Почти половину срока провел за решеткой предприниматель из Волковыска Николай Автухович. Осужденный за неуплату налогов Автухович с самого начала заявлял, что его дело политическое, что власти не простили ему критики налоговых и правоохранительных органов.

До суда в знак протеста предприниматель голодал 70(!) дней. Автухович потерял 40 килограммов веса, его привезли в колонию в очень тяжелом состоянии.

Приговор суда был суров. Николая Автуховича признали виновным в уклонении от налогов и незаконной предпринимательской деятельности, в результате чего местный бюджет понес убытки в размере 1 миллиарда 92 миллионов белорусских рублей. Автуховича осудили на 3 с половиной года заключения с конфискацией имущества. В счет погашения ущерба было описано и арестовано его имущество.

— Это дело подорвало здоровье не только Николаю, — говорит лучший друг Автуховича Владимир Осипенко. — Его жена Елена до сих пор отказывается разговаривать с журналистами о муже. Она столько вынесла, от одних переживаний можно было заработать какие угодно болезни...

В эти выходные Елена была у мужа в колонии на долгосрочном свидании. Три дня они провели вместе. Лена говорит, что Николай чувствует себя гораздо лучше, поправился, выглядит хорошо. Дисциплинарных нарушений у него нет, тюремный режим он соблюдает. Все свободное время много читает, играет в шахматы.

— Жена, наверное, рассказала ему о том, что в стране выходят на волю политзаключенные. Как Николай отреагировал на эту новость, сам он не рассчитывает на условно-досрочное освобождение?

— Насколько я знаю, никаких заявлений о досрочном освобождении Николай не писал. Он не признал своей вины, всегда подчеркивал, что готов сидеть в тюрьме весь срок... Он уверен, что дело его будет пересмотрено. Если бы его изначально рассматривали по закону, то бизнес у Автуховича не отобрали бы, не лишали бы людей, которые у него работали, рабочих мест. Да и меру наказания в отношении Автуховича, как говорили его адвокаты, суд мог бы избрать иной. За неуплату налогов наказывают ограничением свободы, а Николая отправили за решетку. Кто выиграл от этого? Николай в тюрьме, люди вынуждены были скитаться в поисках работы, половина машин и сегодня стоит под забором, местный бюджет не получает налоги... Конечно, пока рано говорить о будущем, но думаю, Николай добьется пересмотрения своего уголовного дела и оправдания...

КОММЕНТАРИЙ ЮРИСТА

Надежда Станкевич, адвокат: *«Верховный суд ограничился отписками»*

— Решение суда мы обжаловали во всех вышестоящих инстанциях, — говорит Надежда Генриховна. — В том числе и в Верховном суде.

В Верховый суд мы направили две подробные и мотивированные надзорные жалобы. Одна наша жалоба уместилась на 17 страницах, вторая практически такая же по объему. А Верховный суд ограничился отписками. Ответы высшей судебной инстанции уместились в несколько абзацев и содержали общие фразы — "изложенные в приговоре выводы о виновности Автуховича являются правильными", и он должен отбывать наказание. Ни по одному из своих доводов я не получила ответа. Такой формальный подход меня очень огорчает.

Мой подзащитный имеет право в порядке надзора обратиться к председателю Верховного суда Валентину Сукало. Сейчас эту жалобу мы и готовим.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ОТОВСЮДУ

Дворцов захотелось

Очередной Ледовый дворец построят в Орше. Об этом заявил председатель Оршанского горисполкома Валерий Шабодалов на очередном совещании, посвященном подготовке "Дожинок-2008".

В совещании принимали участие руководители предприятий, организаций, городских служб. По словам Шабодалова, проект оршанского Ледового дворца сейчас только разрабатывается. Предполагается, что это будет многофункциональный зал на пять тысяч мест, в котором смогут проходить не только спортивные соревнования, но и концерты. Место для строительства Дворца выбрано на площадке за магазином "Раніца", недалеко от комплекса Курган. В 70-е годы в этом месте останавливались гастролирующие цирки-шапито и зверинцы, а в последние годы существования Советского Союза на этой площадке было задумано грандиозное строительство Дома культуры. Но потом СССР распался, Дом культуры построен не был, деньги, выделенные на строительство, ушли неизвестно куда.

Строительство Ледового дворца в Орше еще не началось, но, судя по сжатым срокам, его строительство будет напоминать строительство египетских пирамид.

Накормили карасей брагой?

Факт массовой гибели рыбы зарегистрирован в озере в деревне Пиревичи Жлобинского района.

Озеро в деревне Пиревичи — старейший искусственный водоем в Жлобинском районе (существует с 1900 года). Сообщение о том, что в озере наблюдается мор рыбы, поступило от местных жителей. Предполагается, что причиной мора стало попадание в воду извне продуктов органического происхождения, которые поглотили большой объем кислорода. На фоне жаркой погоды это спровоцировало гибель молодых карасей.

Рядом с озером расположен спиртзавод сельскохозяйственного предприятия "Пиревичи". Не исключено, что производственные отходы попали в водоем и привели к гибели рыбы, эта версия проверяется. Однако окончательные выводы о причине происшествия будут сделаны после получения результатов лабораторного исследования.

Вечна па-за законам

Чацвёртая спроба "Маладога фронту" зарэгістравацца скончылася няўдачай. Упраўленне юстыцыі Мінскага гарвыканкама яшчэ раз адмовіла маладзёжнаму грамадскаму аб'яднанню ў рэгістрацыі. Маладыя людзі маюць намер абскардзіць гэтае рашэнне.

Маладзёжная арганізацыя "Малады фронт" дэ-факта дзейнічае з 1996 года і за гэты час зрабіла чатыры спробы зарэгістравацца. Адпаведна чатыры разы маладыя людзі атрымлівалі адмовы. Прэс-сакратар незарэгістраванай арганізацыі Барыс Гарэцкі кажа, што спрэчныя пытанні, да ўсяго неістотныя, можна было б вырашыць у рабочым парадку.

Аднак афіцыйныя органы так не лічаць. *"На рэгістрацыю быў прадстаўлены пратакол устаноўчага сходу (вышэйшы орган) МГА "МФ", аднак у пункце 5.2. Статута ўказана, што вышэйшым органам "МФ" з'яўляецца Цэнтральная Рада. Акрамя гэтага, у пададзенай графічнай выяве арганізацыйнай структуры МГА "МФ" таксама ўказана, што вышэйшым органам з'яўляецца Цэнтральная Рада"*, — гаворыцца ў адмове на рэгістрацыю.

Хацелася б, канечне, каб такіх праколаў не было. Але нават калі маладыя людзі выправяць гэтую "неадпаведнасць" і пададуць дакументы на рэгістрацыю паўторна — я б даў стопрацэнтную гарантыю, што мінскія юрысты знойдуць іншыя падставы для адмовы.

"Маладафронтаўцы" лічаць адмову незаконнай. Старшыня Мінскай гарадской арганізацыі "Маладога фронту" Дзмітрый Федарук заяўляе, што *"мы будзем адстойваць права на рэгістрацыю да апошняга, таму пойдзем у вышэйшыя судовыя інстанцыі"*. *"Каб потым улада не распачынала новыя крымінальныя справы і не папракала нас, што мы не хочам жыць па законе. Мы пойдзем да канца"*, — адзначыў Федарук.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
31 МАЯ 2007 г.

«Выхаваўчыя гутаркі» са студэнтамі

Улады працягваюць ціск на маладзёжных актывістаў. Цяпер пад увагу праваахоўных органаў трапілі актывісты незарэгістраванай арганізацыі "Задзіночанне беларускіх студэнтаў". Каля двух дзесяткаў маладых людзей былі запрошаны ў пракуратуру Мінска. Сярод запрошаных Яўген Іванюк, Настасся Шамрэй, Алена Талапіла. У выніку "выхаваўчай гутаркі" студэнтам былі ўручаны афіцыйныя папярэджанні "Аб недапушчальнасці дзеянняў, накіраваных на незаконны ўдзел у дзейнасці ліквідаванай маладзёжнай арганізацыі "ЗБС".

Самі актывісты мяркуюць, што гэта спроба запалохаць моладзь у сувязі з пратэстнымі акцыямі супраць адмены льгот. Праваабаронцы адмаўляюцца даваць дакладныя прагнозы, бо, па іх словах, гэта можа быць як спроба запалохаць моладзь, так і пачатак новай крымінальнай справы супраць маладзёжных актывістаў.

Фота photo.bymedia.net

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Гарачы Кангрэс

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Папракаў Мілінкевіча і старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка. Як чалавеку, адказнаму за міжнародную дзейнасць адзінага кандыдата, Вячорку наогул няма ў чым апраўдвацца, — ні ў адным накірунку не было зроблена болей. Але старшыня Партыі БНФ прызнаў, што пад старшынствам Мілінкевіча Палітсавет фактычна спыніў сваю дзейнасць яшчэ летам мінулага года. І ўсё, што адбывалася ў апошні год, Вячорка назваў "працай раз'яднаных дэмакратычных сіл".

У Мілінкевіча не ўздрыгнуў ні адзін мускул. Ён у гэты час аб нечым перагаворваўся з жонкай — Інай Кулей. Сцішыўся і "Малады фронт" — хлопцаў і дзяўчат перасялілі на балкон, бо высветлілася, што яны не з'яўляюцца дэлегатамі Кангрэса і, як усе госці, не павінны знаходзіцца ў зале. Зрэшты, і справа ўжо ішла пад вечар...

Дзень другі

Народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча зала вітала стоячы. *"Галоўная стратэгія — дабіцца змены дыктатарскага, антыбеларускага, антынацыянальнага рэжыму. Гэтага вызначэння ў стратэгіі няма, але так абыходзіцца са сваім народам можа толькі антынародны рэжым... Я падзяляю думку, што нельга прызначыць лідэра. Палітычны дзеяч гэтую місію здабывае працай, сваёй дзейнасцю. Шлях не перакрыты нікому — толькі працуй".*

Так пачыналіся галоўныя дэбаты Кангрэса — па стратэгіі дзеянняў беларускіх дэмакратаў.

Думкі відавочна падзяліліся.

Павел Севярынец: *"Нам не трэба вызначацца з лідэрам. У нас ужо ёсць лідэр — і гэта Аляксандр Мілінкевіч. Праеўрапейскі шлях — вось выбар Беларусі".*

Анатоль Ляўковіч: *"Не патрэбна ніякая праеўрапейская стратэгія, нам патрэбна наша стратэгія, прабеларуская".*

Аляксей Янукевіч: *"Партыя БНФ падчас рэгіянальных сходаў выступала за адзінае лідэрства. Але як адказная палітычная структура дзеля адзінства дэмсіл мы далучаемся да меркавання большасці. Трэба служыць не лідэрам, а Беларусі...".*

Леў Марголін: *"Некаторым тут патрэбен скандал, піяр. Пад лозунгі аб адзінстве дзеля сваіх амбіцый гатовы разысціся ў розныя бакі".*

Аляксандр Бухвостаў: *"Я прапаноўваю работу Палітсавета прызнаць нездавальняючай. І калі работа прызнаецца нездавальняючай, той, хто кіраваў, павінен сысці".*

Віктар Карніенка: *"Без арганізацыйнай пабудовы нельга рэалізаваць любую стратэгію. Патрэбен лідэр".*

Ізноў Севярынец, ізноў Ляўковіч... Выступоўцы пайшлі па другім, трэцім крузе. Відавочна, што як ні стараліся прыйсці да Кангрэса з большменш узгодненай пазіцыяй — нічога не атрымалася.

Нарэшце надышоў і час галасаваць. Але тут высветлілася, што нехта скраў частку дэлегацкіх картак, якія даюць права на галасаванне. Акрамя таго, у зале з'явіліся людзі з карткамі ўзору 2005 года. У адказ мандатная камісія запатрабавала перарэгістрацыі дэлегатаў. Нягледзячы на свіст і выкрыкі, перарэгістрацыя пачынаецца.

У выніку былі пацверджаны паўнамоцтвы 611 дэлегатаў, кожнаму *"сапраўднаму"* наляпілі спецыяльную адзнаку, без якой наогул не пускалі ў залу.

Пачынаецца галасаванне. *"Хто за тое, каб была прынята стратэгія дзеянняў дэмакратычных сіл, прашу галасаваць",* — аб'яўляе з прэзідыума Аляксандр Дабравольскі. Цішыня неймаверная. Лес рук. Доўгі напружаны падлік. Хто-ніхто ўстаў, каб яго *"голас"* было лепей відаць.

Нарэшце старшыня падліковай камісіі Мікалай Пахабаў абвяшчае: 463 дэлегаты прагаласавалі "за". Сярод партыйцаў авацыя.

"Хто супраць?" — падае голас Аляксандр Дабравольскі.

Зноў цішыня, зноў падлік. Рук значна меней. *"Супраць 190",* — разгублена канстатуе Мікалай Пахабаў. Па зале проста нейкай жывой хваляй пракатваецца здзіўленне: прагаласаваўшых аказалася больш, чым дэлегатаў Кангрэса.

Хутка, аднак, высвятляецца і прычына: некаторыя з тых, хто не жадае змірыцца з тым, што апынуўся ў меншасці, галасавалі і *"за"*, і *"супраць"*. Каб атрымалася зусім абракадабра, каб зацягнуць час, каб, баючыся спазніцца на цягнікі, з залы сышлі людзі з рэгіёнаў, і каб не засталося кворуму... Што рабіць? Загучалі нават прапановы пры галасаванні адбіраць мандаты. Але дэлегаты не пагадзіліся з тым, каб быў адабраны іх галоўны дакумент. Нарэшце Аляксандр Дабравольскі проста заклікаў і Мілінкевіча, і яго "групу падтрымкі" да сумленнасці: *"Аляксандр Уладзіміравіч, мне тут падказалі, што і вы сам галасавалі і "за", і "супраць". Гэта непрыгожыя метады".*

Вырашыўшы сачыць адзін за адным, дэлегаты прыступілі да паўторнага галасавання. *"Казусаў"* больш не было. Пераважнай большасцю дэлегаты прагаласавалі за сустаршыства ў Палітсавеце і за стратэгію, прапанаваную аналітычнай групай Аб'яднаных дэмакратычных сіл. Мілінкевіч перастаў быць *"адзіным"* і быў відавочна разгублены.

Такім чынам

Аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі будзе кіраваць Палітсавет, у якога чатыры сустаршыні: **Вінцук ВЯЧОРКА, Сяргей КАЛЯКІН, Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА і Анатоль ЛЯЎКОВІЧ** (усе спадзяюцца, што хутка выйдзе Аляксандр Казулін і зменіць Ляўковіча на гэтай пасадзе). Павінна было быць пяць сустаршыняў, але Аляксандр Мілінкевіч, як гаварылася вышэй, ад пасады адмовіўся. Ён заявіў, што будзе займацца стварэннем свайго руху "За свабоду!". У той жа час *"людзі ад Мілінкевіча"* на чале з Віктарам Карніенкам у Палітсавет увайшлі. Гэта, як падаецца, дае надзею, што развод, які адбыўся, не зусім канчатковы. Зрэшты, тым, што кааліцыі развальваюцца пасля выбараў, нікога не здзівіш — так было амаль паўсюль. Асабіста мяне здзівілі метады, якімі некаторыя спрабавалі захаваць статус-кво. Што-што, але да дэмакратыі яны не маюць аніякага дачынення.

Святлана КАЛІНКІНА.

ПРОИСШЕСТВИЕ

Вместо последнего звонка...

В последние дни учебного года в Толочинском районе ученики средней школы №1 оказались на больничной койке. Всего в больницу с диагнозом "дизентерия Зоннэ" оказались 44 человека.

Как выяснили эпидемиологи, источником инфекции стали двое сотрудников школы, у которых при обследовании было выявлено аналогичное заболевание. Причиной распространения болезни послужили несколько факторов, главные из которых — плохая обработка посуды в пищеблоке.

Среди пострадавших — учащиеся преимущественно начальных классов, несколько человек из 4—6-х классов и один 11-классник.

Игорь МОРОЗОВ.

ПРАБЛЕМА

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Міхаіл Паплаўскі звярнуўся да прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага з просьбай разгледзець магчымасць падвышэння пенсій для кіраўнікоў буйных прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў

"Калі гаварыць пра кадры і іх ролю, то гэта хрыбет нашай дзяржавы, — гаворыць Паплаўскі. — *З гэтых кіраўнікоў трэба не толькі жорстка патрабаваць, іх яшчэ і шанаваць трэба. Усе ведаюць, што сёння цяжка знайсці разумнага начальніка цэха, галоўнага спецыяліста, намесніка кіраўніка і кіраўніка. Таму што спагнанні з іх жорсткія, а сацыяльныя гарантыі для іх слабыя. Гендырэктар буйнога аб'яднання пры выхадзе на пенсію атрымлівае яе на ўзроўні, не вартым ягонага ўнёску ў развіццё эканомікі дзяржавы. Я прашу прыраўняць кіраўнікоў прадпрыемстваў па пенсійным забеспячэнні да дзяржслужачых".*

Нягледзячы на тое, што Паплаўскі звяртаўся да Сідорскага, адказ яму даслалі з Міністэрства труда і сацыяльнай абароны за подпісам міністра **Уладзіміра Патупчыка.** Міністр супраць таго, каб дырэктарскаму корпусу падвышалі пенсіі. Таму Міхаіл Паплаўскі падчас адказаў прадстаўнікоў урада на дэпутацкія пытанні напрамую звярнуўся са сваёй просьбай да віцэ-прэм'ера **Уладзіміра Сямашкі.**

— Я як былы дырэктар прадпрыемства таксама лічу, што абсалютна несправядліва гэта ў адносінах да дырэктарскага корпуса, — шчыра адказаў віцэ-прэм'ер. — *Бо працуючы па 12—16 гадзін у суткі, без выхадных і прахадных, па выхадзе на пенсію яны прыраўніваюцца да ўзроўню таго, хто сёння асабіліва не напружваецца, прыбірае, напрыклад, наша памяшканне. Гэта несправядліва і спараджае цэлы шэраг пытанняў, у тым ліку і карупцыйных.*

Сёння сапраўды цяжка знайсці дырэктара. Мы з вялікай цяжкасцю адшукалі дырэктара Беларускай нафтавай кампаніі. Гэта вельмі складана, бо дырэктар павінен быць і адукаваным, і кваліфікаваным, і сумленным. Яму прыходзіцца працаваць, як я ўжо казаў, па 16 гадзін у суткі, але сацыяльна ён амаль не абаронены. Людзі разумеюць гэта і таму не вельмі пагаджаюцца на такія адказныя пасады. У нас праблемы ў гэтым сэнсе па многіх прадпрыемствах, мы шукаем дырэктараў. Хаця я павінен адзначыць, што апошнім часам ёсць некаторыя зрухі. Так, для асобных прадпрыемстваў, дырэктараў, мы ўвялі каэфіцыент 4,5, і сёння такія дырэктары, як, напрыклад, на Беларускім металургічным заводзе, атрымліваюць сярэднямесячны заробак каля 3 тысяч долараў. Ну там, праўда, і па заводзе заробкі сёння прыкладна 1 мільён 180.

Але я цалкам падзяляю вашу заклапочанасць. Таму магу паабяцаць, што мы яшчэ раз сур'ёзна падумаем над гэтым пытаннем, і ў верасні мы вернемся да гэтага пытання.

ДАРЭЧЫ

Пад пільную ўвагу праваахоўных органаў трапіў дырэктар РУП "Мінск-Крышталь", які, як сказаў Уладзімір Сямашка, разліваў і прадаваў брэндзі як пяцізоркавы каньяк.

Праўда, распавесці нейкія падрабязнасці гэтай справы віцэ-прэм'ер адмовіўся.

Марына КОКТЫШ.

ДЫСКУСІЯ

Пад абцасам

чыноўнікаў апынуўся беларускі тэатр

Праблемы беларускага тэатра і нацыянальнай драматургіі цяпер падымае толькі незалежная "Народная воля" — дзяржаўныя СМІ на такую "крамольную" тэму "возникать" не адважваюцца.

Праўда, не ўсе публікацыі, на мой погляд, выходзяць аднолькава трапнымі. У апошнім выступе ("Народная воля" за 3 мая 2007 г.), дзе ў загаловак вынесены слушныя словы шаноўнага Валерыя Мазынскага **"Сённяшні беларускі тэатр нагадвае мне страуса, які на два метры засунуў галаву ў пясок, каб не бачыць, што дзеецца навокал..."** і стаіць рубрыка "Праблема!", у цэлым праблема глыбока не закранаецца. Асцярожненька і не надта ўцямна паразважаў на тэму **Аляксей Дударэў,** адораны ўладаю сваім Тэатрам Беларускай арміі, — дарэчы, не толькі драматург і дырэктар, а і старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў. Чарговы раз паабураўся малады **Андрэй Курэйчык,** які лічыць сябе беларускім драматургам, але піша далёкія ад беларускіх праблем п'есы на рускай мове і ставіць іх у блізкім і далёкім замежжы... Загадчык літаратурнай часткі тэатра імя Янкі Купалы **Лавінія Арэшка** пажаліўся на тое, што сучасныя п'есы беларускіх аўтараў цякуць у тэатр, на жаль, тонкай ручаінкай, ды яшчэ прызналася: маўляў, і тое, што прыплывае, *"не заслугоўвае, каб быць прачытаным".* Затое рэжысёр **Валерый Мазынскі,** якога ўлада, у адрозненне ад А.Дударава, пазбавіла створанага ім тэатра "Вольная сцэна", а сам тэатр ліквідавала, сказаў адкрыта тую праўду, якую нельга замоўчваць: *сённяшні беларускі тэатр баіцца чэсных, праўдзівых твораў пра сучаснасць.*

Сказана моцна. Але... хіба ў нас тэатральныя праблемы вырашае тэатр? І асацыятыўна бачыцца тут не галава страуса, а — азадак улады, які падмяў пад сябе ўсё і ўся. І ці варта ў такой сітуацыі сцвярджаць, нібыта беларуская драматургія і правалілася некуды ў прадонне разам з драматургамі?

Як літаратурны крытык і выкладчык беларускай літаратуры, у тым ліку і літаратуры для тэатра, бяру на сябе адказнасць запэўніць: **у нас заўсёды была і сёння ёсць годная драматургія! Чаго ў нас няма, дык гэта спрыяльнага стаўлення ўлады да развіцця нацыянальнай культуры, мовы, літаратуры.** З гэтай прычыны доўгімі гадамі не паўстае і нацыянальная рэжысура. Рэжысёры ў Беларусь завозяцца з Расіі, а выпускнікі нашай Акадэміі мастацтваў (раней Тэатральна-мастацкі інстытут) пасылаюцца хоць куды, толькі не ў свае тэатры.

Была некалі ў тэатрах беларуская драматургія — сацыяльна-праблемная, сатырычна-камедыйная. Праўда, часцей беларусы нярэдка смяяліся з сябе, ды толькі не ў сябе дома... З гэтай нагоды Андрэй Макаёнак аднойчы сказаў з горкай іроніяй: "Дзякуй Богу, што ў нас ёсць Масква!" У тым сэнсе, што калі ў Маскве ці дзе яшчэ на прасторах былога СССР беларускую п'есу паставяць, то тады ўжо і дома ёй можна будзе прарвацца-вырвацца ўсё з-пад таго ж тутэйшага ўладна-чыноўнага ўціску.

Не ў такім ўжо далёкім мінулым перакладзеныя з беларускай мовы на іншыя мовы п'есы Аркадзя Маўзона, Кастуся Губарэвіча, Андрэя Макаёнка, Мікалая Матукоўскага, Алеся Петрашкевіча, Анатоля Дзялендзіка, Аляксея Дударава былі ўганараваны апладысментамі гледачоў дзесяткаў тэатраў былога Саюза. Што да нас, беларусаў, то многіх спектакляў па беларускіх п'есах мы так і не пабачылі...

Пад тым жа ўціскам — ужо новай улады — сітуацыя ў Беларусі (і ці толькі ў тэатры?) значна пагоршылася. Пад прэсам агалцелай русіфікацыі беларуская мова выціснута з усіх сфер ужытку: у школах, ВНУ, навуцы, справаводстве, рэкламе і г.д. Занядбана сфера культуры, у тым ліку і тэатральная. Расійская "папса" запаланіла не толькі тэлебачанне, але і ўсю духоўную прастору краіны. Гістарычная памяць пад забаронай. Замбіраванне новай прыдуманай ідэалогіяй дасягнула памераў праграмных. Вуліцы ў сталіцы, гэта праўда, "зачищены" да бляску і "умиляют" прыезджых, ды турмы напіханыя пад завязку і прымаюць усё новых вальнадумцаў... Абывацелі розных катэгорый, у тым ліку тэатральнай і культурна-чыноўнай, запалоханы да крайнасці. Чаго вартыя падзеі толькі ў адным Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М.Горкага: паводле палітычных матываў тут выставілі за дзверы маладога таленавітага акцёра і рэжысёра Паўла Харланчука (пра гэта з хваляваннем чытала нядаўна ў "Народнай волі"). Прэсінгаваныя "тутэйшыя" трымцяць ад страху і моляцца: "Как бы чего не вышло..."

Які б, здавалася, зараз тэатр? Якія нацыянальныя п'есы ва ўмовах унутранай эміграцыі і фактычнай акупацыі? Якія грамадзянскія парывы творцаў пад страхам турмы ці, у лепшым выпадку, біржы беспрацоўных?! Але па абавязку прафесіянала мушу параіць не спяшацца з высновамі, быццам усе нашы драматургі і раманісты крылы апусцілі і насы на квінту павесілі. Якраз у такія смутна-сумныя часы і нараджалася сапраўдная літаратура і літаратура для тэатра! Ну, хоць бы тыя ж "Тутэйшыя" Янкі Купалы, якія за апошнія дзесяцігоддзі не раз выводзіліся з рэпертуару Купалаўскага тэатра. Не разумеюць чыноўныя небаракі, што "Тутэйшыя" такія ж бессмяротныя, як і нашы прыўладныя Зносакі. А зараз, кажуць, дэкарацыі спектакля ў тым жа тэатры нібыта зноў вось-вось "разваляцца"...

Літаратары ў нас, на шчасце, не самыя слабыя і палахлівыя, хоць і на іх ціск ідзе — ого! Мноства пісьменнікаў — маладых, сярэдняга ўзросту і сталага веку, у тым ліку і драматургаў, з-за цэнзурных варункаў не маюць магчымасці надрукавацца ці паставіцца ў тэатрах. Але ж гэта зусім не азначае, што яны не працуюць. Працуюць — і плённа, актыўна, натхнёна, бо бачаць, што *"адбываецца навокал",* як Валерый Мазынскі кажа. Пішуць "пісакі" (так чынавенства іх называе) і на тэатры не аглядаюцца. Разумеюць: не заўліты і не рэжысёры нават вырашаюць, што ў тэатры мае быць пастаўлена, а што катэгарычна не можа.

У 2003 годзе, напрыклад, выйшаў з друку зборнік **"Сучасная беларуская драматургія. Традыцыі і наватарства".** І, скажу вам, там ёсць што пачытаць нават Лавініі Арэшка! Няхай бы "снизошла", хоць па доўгу службы, да **Уладзіміра Бутрамеева, Сяргея Кавалёва, Галіны Багданавай, Андрэя Карэліна, Людмілы Рублеўскай, Уладзіміра Сіўчыкава, Пятра Васючэнкі.** Варта прачытаць не толькі ўжо надрукаванае, а і новае, што за апошнія пяць гадоў яны ў шуфляду да часу склалі. Хаця б таго ж Пашу Пражко, што ў Маскве паставіўся. А чаму ў Тэатры Янкі Купалы не прывезлі? Андрэю Курэйчыку прапанавалі б заказ на нацыянальна-сацыяльную ці нацыянальна-філасофскую драму або беларускую прытчу. Ён жа ўмее гэта рабіць.

Не нясуць у тэатры сваіх п'ес ні маладыя, ні сталыя, ні старыя, бо тое, што пішацца імі сёння, відавочна, будзе адхілена ў міністэрствах і ўправах.

Складае ў шуфляду ці ў лепшым выпадку надрукуе ў газеце "Народная воля" або ў "Нашым слове" новую п'есу цяпер ужо наш старэйшы драматург Алесь Петрашкевіч: дзякуй Богу, насуперак гадам, мае добрую пісьменніцкую форму і зайздросны драматургічны плён. Калісьці многія яго драмы, трагедыі, сатырычныя камедыі ішлі ў святле рампаў у мностве тэатраў Расіі, саюзных і аўтаномных рэспублік, там паказваліся і па тэлевізіі.

Па тым, што чытала і чытаю ў рукапісах з-пад пяра Алеся Лявонавіча, магу сказаць з усёй упэўненасцю: ён — драматург не былы, а будучы. Яго п'есы вызначаюцца актуальнасцю, сацыяльным аптымізмам, бескампраміснай вастрынёй, глыбокім гістарызмам, нясцерпным болем за Айчыну, што аніяк не можа вырвацца з кола чужацкіх акупацый і інкарпарацый. Аўтар-даследчык свой багаты талент і працалюбнасць цалкам аддаў справе, якой служыць, — сучаснай беларускай драматургіі. Але ці часта мы бачым гэты плён зараз на сцэне? Акрамя п'ес, пастаўленых у розныя часы, у яго шмат ненадрукаваных. Пра выданне п'ес за свой кошт і размовы няма: пісьменнік жыве на жабрацкую пенсію, большая частка якой ідзе на лекі і камунальныя паслугі, а дзяржаўнага кошту яму сёння ўлада не дасць.

Сёння на аўтарскім стале Алеся Лявонавіча новыя драмы: **"Інтэлігенты"** — пра расколіну, што падзяліла нашых суайчыннікаў; **"Прагноз на паслязаўтра"** — прадбачанне, якое, на жаль, спраўдзілася, пакуль п'еса з 1994 года адлежвалася ў шуфлядзе; **"Памінкі-ўспамінкі"** — трагедыя апошняга жыхара вымерлай "неперспектыўнай" вёскі; **"Скрадзены крыж"** — пра крыж святой Еўфрасінні ў палоне рабаўнікоў ад расійскіх князёў і цароў да наркама Берыі і сакратара ЦК КПБ Панамарэнкі; **"Інтэрнацыянал па-беларуску"** — сатырычная камедыя, дзе паўстае беларус — нямы, глухі, затурканы, хоць усё разумее, а выказаць не можа (надрукавана сатыра ў часопісе "Тэрмапілы", Польшча, №3, 2000 г.).

Пра сатырычную камедыю **"Злыдзень"** варта распавесці асобна, бо яна выклікае асацыяцыі з мітуслівымі дзеяннямі ўладаў вакол Купалавых "Тутэйшых". Больш за трыццаць гадоў таму **Кандрат Крапіва,** які бласлаўляў многія п'есы Алеся Петрашкевіча ў жыццё, сказаў пра "Злыдня": *"З вашых п'ес, што я прачытаў, "Злыдзень" — найлепшая, але вам з ёю будзе цяжка. У нас, акрамя гледачоў, сатыру ніхто не любіць..."*

Аўтар, відаць, па наіўнасці спадзяваўся, што сатыру ўратуе ленінскі эпіграф пра тое, што *"если мы и погибнем, то от бюрократизма".* Адзін высокана-менклатурны партыйны функцыянер ці то з мэтай дапамагчы аўтару, ці то з ахвотай на яго данесці перадаў тэкст п'есы разам з эпіграфам-абярогам Пятру Машэраву. (Той прачытваў усе беларускія п'есы, што меліся быць пастаўлены ў тэатры.) Кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П.М.Машэраў, азнаёміўшыся з п'есай, адразу ж паклікаў аўтара на дыванок. *"Читал вашего "Злыдня"... Ну что же... Хорошая тема, удачный сюжет, по языку неплохо. Пьеса с чертом — это хорошо..."* Доўгая паўза — і рэзкі ўсплёск суровасці ў голасе: *"Но!..* — зноў паўза, і катэгарычна, павышаным тонам: — *Но, если ваш "злыдзень" будет так активно действовать, мы коммунизма не построим никогда!.."*

Драматург успамінае, што пачутае не столькі яго напалохала, колькі здзівіла-азадачыла: "Як жа гэта я, такі дурны, ужо разумею, што мы камунізму не пабудуем ніколі, а ён, такі разумны, яшчэ не разумее гэтага?" Тым не менш п'есу з вёрсткі часопіса "Полымя" аўтару давялося зняць у парадку партыйнай дысцыпліны, а рукапіс кінуць у шуфляду, дзе п'еса праляжала да 1980-х гадоў, з кожным годам набіраючы актуальнасці, таму што недаразвіты сацыялізм як першая фаза камунізму набліжаўся да поўнага развалу...

Тады рэжысёр Георгій Несцер і паставіў "Злыдня" па старым рукапісе (з тым жа эпіграфам Ільіча, які відавочна для ўсіх спраўджваўся) у Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі ў Бабруйску. На прэм'еры гледачы трымаліся за жываты. А сакратар гаркама партыі быў суровы, як манумент. Раніцай пазваніў дырэктару тэатра і загадаў павесіць цыдулку побач з касай пра тое, што спектакль з пракату здымаецца... Твор ізноў адправіўся ў шуфляду, а злыдні ўсіх калібраў — натуральныя, жывыя — шуруюць, як і тады, "напярэдадні камунізму".

Творчы подзвіг драматурга-гісторыка Алеся Петрашкевіча пацвярджае патэнцыяльныя магчымасці нашай пісьменніцкай інтэлігенцыі ў адраджэнні нацыі, яе гістарычнай і дзяржаўнай памяці. Подзвіг — так, ужыву гэтае высокае слова — пачаўся яшчэ чвэрць стагоддзя таму. За гэты час драматург стварыў цэлы серыял гістарычна-дакументальных п'ес па нявыдуманых сюжэтах. У "серыял" увайшло 18 твораў, якія "закрылі", а дакладней, адкрылі для нас ажно XI стагоддзяў (!) сапраўднай беларускай гісторыі. Праца драматурга і вучонага-гісторыка, які мае энцыклапедычны досвед, уяўляе сабой канцэптуальную мастацкую гісторыю Беларусі ў рэальных дзейных асобах. Варта назваць гэтыя п'есы, размешчаныя ў храналагічным парадку:

"Гора і Слава" ("Русь Кіеўская") — трагедыя, прысвечаная хрышчэнню Русі Кіеўскай і княства Полацкага, гісторыі князёўны Рагнеды Рагвалодаўны;

"Меч Рагвалода" — драма аб умацаванні незалежнасці і дзяржаўнасці княства Полацкага князем Усяславам Чарадзеем;

"Над дзяржавай — знак Пагоні" — драма-інсцэніроўка паводле рамана Генрыха Далідовіча "Кліч роднага звона", прысвечанага стварэнню Вялікага княства Літоўскага;

"Крыжовы шлях на Грунвальд" — трагедыя пра братоў — Вялікага князя ВКЛ Вітаўта і караля Польшчы Ягайлы і іх сумеснай перамозе над крыжакамі;

"Расплата за здраду" — драма пра мяцеж князя Міхайлы Глінскага (нашчадка Мамая) супраць караля Польшчы Жыгімонта і першую спробу "інтэграцыі-інкарпарацыі" Вялікага княства Літоўскага ў Масковію;

"Напісанае застаецца" — драма, прысвечаная жыццю і дзейнасці Асветніка і Першадрукара Францішка Скарыны;

"Прарок для Айчыны" — драма, прысвечаная подзвігу Францішка Скарыны ў справе асветы беларускага (ліцвінскага) краю;

"Каралеўска-царская пастка" — драма барацьбы патрыётаў Айчыны супраць уніі ВКЛ і Каралеўства Польскага;

"Рупнасць дзяржаўцы" — драма пра змаганне канцлера ВКЛ Льва Сапегі за незалежнасць Вялікага княства Літоўскага ў Рэчы Паспалітай;

"Час усё адкрые" — трагедыя паразы Вялікага княства Літоўскага падчас агрэсіўнага нападу войска маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча і вынішчэння нашага народа;

"Развітанне з Радзімай" — драма падзелу Рэчы Паспалітай і паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі;

"Смерць або Перамога!" — трагедыя паўстання пад кіраўніцтвам Якуба Ясінскага супраць расійскай акупацыі на Беларусі;

"Рыцар свабоды" — трагедыя паўстання 1863 года пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага;

"Приласкать и уничтожить" — трагедыя падчас стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі;

"Белорусский вопрос" — трагедыя стварэння першай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікі (БССР) у 1919 годзе;

"Апошні збройны чын" — трагедыя Слуцкага паўстання 1920 года;

"Воля на крыжы" ("Наканавана быць Прарокам") — трагедыя, прысвечаная Янку Купалу і пачатку масавых рэпрэсій 1930-х гадоў на Беларусі;

"Дагарэла свечачка" — трагедыйны маналог беларускай сялянкі, ахвяры чарнобыльскай навалы.

Рэдкі дар мае драматург, якому дадзена намаляваць праўдзівую карціну стагоддзяў беларускай гісторыі. Створанага ім не на год хопіць не аднаму тэатру для ўвасаблення на сцэне. Але адну з апошніх п'ес — пра Купалу — той жа Купалаўскі тэатр пасля доўгага марынавання вярнуў Алесю Лявонавічу — для вяртання ў шуфляду...

Я ўсё ж глыбока веру ў тое, што прыйдзе час, калі ў нас будзе нашмат болей беларускіх тэатраў, а сярод іх і тэатр "Гістарычнай п'есы". І ў яго афішы побач з гістарычнымі спектаклямі Уладзіміра Караткевіча будуць стаяць спектаклі **Алеся Петрашкевіча,** інсцэніроўкі па раманах **Генрыха Далідовіча, Вольгі Іпатавай, Леаніда Дайнекі, Уладзіміра Арлова** ды іншых таленавітых раманістаў і маладых літаратараў. Бог павялічыць нам квоту на драматургаў!

...Тэатр, родная мова адрадзілі некалі чэшскую мову і дзяржаву Чэхія. Польская гістарычная раманістыка захавала польскую нацыянальную ідэю. Менавіта ідэя вярнула народу волю і незалежнасць! Прыйдзе час і Беларусі! А зараз, па вялікім рахунку, у нас крызіс не тэатра і драматургіі, а — Сістэмы, час якой, трэба верыць, — не вечны.

Лідзія САВІК, кандыдат філалагічных навук.

Народная Воля http://www.nv-online.info
31 МАЯ 2007 г.

ОФИЦИАЛЬНО

С нового года льгот уже не будет

На минувшей неделе Палата представителей сразу в двух чтениях и почти единогласно приняла проект закона, предусматривающий упорядочение социальных льгот, прав и гарантий для отдельных категорий граждан. Через пару дней законопроект безоговорочно поддержал Совет Республики. Согласно закону, льгот лишены студенты, пенсионеры, инвалиды, ликвидаторы аварии на ЧАЭС.

"Принятие этого закона обусловлено необходимостью совершенствования системы социальных льгот на основе социально-экономической эффективности, адресности и комплексности", — заявил депутатам министр труда и социальной защиты **Владимир Потупчик.**

По его словам, существующая нынче система социальных льгот ведет *"к неэффективному распылению бюджетных средств"*. Так, в прошлом году из бюджета на эти цели было выделено более 600 млрд белорусских рублей, *"в то время, как на пособия семьям, воспитывающим детей, было выделено 130 млрд рублей, на реализацию программы обеспечения демографической безопасности — 177 млрд рублей, на льготы выделяется значительно больше средств, чем на важные государственные программы"*.

Потупчик считает, что *"льготы не оказывают влияния на повышение уровня жизни людей, на сокращение количества малообеспеченных семей"*. По словам министра, *"наиболее обеспеченные люди получают льгот в 1,3 раза больше, чем малообеспеченные, не реализовывают свое право на льготы жители сельской местности — в крупных городах граждане получают льгот в 1,7 раза больше, чем жители сельской местности"*, *"чрезмерное расширение льгот является одной из причин хронической убыточности транспортных предприятий, организаций жилищно-коммунального хозяйства"*.

"В 1990-е годы практика предоставления льготы была оправданной, потому что более половины населения находилось за чертой бедности, — сказал Потупчик. — *Сегодня ситуация иная"*.

По мнению Потупчика, существующая система государственных социальных льгот должна быть заменена *"адресной социальной поддержкой, которая должна носить исключительно конкретный характер"*.

Правда, министр труда пока не может ответить на конкретный вопрос, кому и по каким критериям будет оказываться эта адресная социальная помощь. Соответствующий проект указа в течение ближайших трех месяцев должны внести на рассмотрение А.Лукашенко.

ОВАЛЬНЫЙ ЗАЛ

Ольга АБРАМОВА:

«После принятия данного закона социальная температура по стране резко повысится...»

*Из всех депутатов Палаты представителей только **Ольга Абрамова** проголосовала против принятия скандального законопроекта "О государственных социальных льготах, правах и гарантиях для отдельных категорий граждан". О том, что будет голосовать "против", Абрамова сказала вслух.*

*Выступление Ольги Михайловны было аргументированным и взвешенным, но все же не таким критичным, как **Виктора Кучинского.** Кстати, Кучинский в первом чтении проголосовал "против", а во втором — "за". О позиции таких одиозных фигур, как **С.Гайдукевич, С.Костян, Ю.Кулаковский**, и говорить не стоит.*

Вот некоторые выдержки из речи Абрамовой и Кучинского.

— Льготы отменяются прежде всего в целях экономии бюджетных средств, — *сказала Абрамова.* — Этого никто особо и не скрывает, хотя и говорится о перенаправлении средств на адресную социальную помощь. Разные мотивы в разное время приводились нам как повод для принятия данного законопроекта.

Я считаю, что мы упорядочиваем льготы неверно по форме и несправедливо по содержанию. Принимать этот закон нужно было только одновременно с законом об адресной социальной помощи. Было бы еще лучше, если бы закон об адресной помощи прошел вперед того, который мы рассматриваем. При этом следовало бы предусмотреть денежную компенсацию по категориям граждан, которые не войдут в акт об адресной социальной помощи, или же заранее повысить пенсии, стипендии или другие виды выплат, как предлагали некоторые депутаты...

Разве ветераны труда, которым государство большую часть жизни недоплачивало за их труд, не имеют права на внимание в старости? Тогда дайте им такую пенсию, чтобы хватало не только на проезд за полную стоимость в городском и пригородном транспорте, и я думаю, что они будут вполне довольны.

А узники нацистских концлагерей — кому и чем не угодили они?

Уверена, что после принятия данного закона социальная температура по стране резко повысится. Уверена, что для ее снижения мы еще будем много раз обращаться к изменениям социального законодательства.

Виктор КУЧИНСКИЙ: «Палата представителей и депутатский корпус — это не козлы отпущения...»

— Я считаю, что закон, который был принят во времена Советского Союза, не стоит отменять. Он был хорош тем, что давал возможность к концу жизни установить телефон, получить квартиру. Хорошо это или плохо? Наверное, хорошо. Потому что человек жил надеждами, что если не сегодня, так завтра, а если не завтра, то через пять лет хоть что-то получит...

С одной стороны, после распада Союза и обретения Республикой Беларусь самостоятельности назрела необходимость привести в порядок вопросы, касающиеся тех льгот и социальных дотаций, которые уже не действуют. Например, количество участников Великой Отечественной войны уже минимальное, может быть, и не стоило трогать эту часть. Но коль речь идет о том, что нужны средства в бюджете для решения каких-то других серьезных проблем, то было бы важно, если бы со стороны в первую очередь правительства была проведена соответствующая работа со СМИ — чтобы людям объяснили, почему подготовлен данный проект закона. Чтобы не было так, что, когда мы приедем в свои избирательные округа, люди будут говорить: "Это же вы принимали эти законы!" Палата представителей и депутатский корпус — это не козлы отпущения.

Критикуя правительство, я хочу сказать: а почему вы не занимаетесь экономикой? Я хочу зачитать вам одну справку о заработной плате и других доходах за 2006 год, которую выдали 01.05.2007 года моему избирателю **Геннадию Игнатюку.** Он работает в коммунальном унитарном предприятии "Бытсельхозуслуги" Кобринского района. Общая сумма доходов за год составила 1 миллион 554 тысячи 475 белорусских рублей. Сейчас его жена беременная, у них первый ребенок, они не достроили дом, потому что не могут взять кредит. И у меня возникает вопрос: а если в этой семье, упаси Господь, заболеет ребенок? Что они будут делать?

Почему перед принятием такого важного в политическом плане закона не подготовили указ президента об адресной помощи, а потом бы, соответственно, приняли и этот законопроект? Ну почему у нас все вот так как-то?..

А что будет завтра? Мы можем отменить все льготы, но что будет потом? Ведь если сегодня экономика не будет нормально работать, наверное, будет еще хуже. А созданы ли сегодня нормальные условия для работы субъектов хозяйствования? Сегодня сплошь и рядом исполнительная вертикаль власти вмешивается в хозяйственую деятельность. А отвечают они за свои действия или нет?

Мы сегодня живем как бы при капитализме, но система управления осталась социалистической, советской — и по вертикали, и по горизонтали...

Я знаю, что этот закон не решит все наши проблемы. Самая главная проблема в том, как работает экономика. Я уже неоднократно говорил: мы сегодня в этом Овальном зале принимаем все! Такого депутатского корпуса, такой Палаты представителей, наверное, со времен 12-го созыва не было! Мы сегодня все что угодно можем принять! Так возникает вопрос: почему же почти во все, что принимается, в конечном итоге через три месяца вносятся какие-то поправки?! Это говорит о чем? О некачественной работе правительства. Да, я критикую сегодня правительство, потому что именно оно сегодня отвечает за экономическую составляющую. Я не затрагиваю президента — не хочу эту тему трогать. Потому что, если, скажем, премьер-министр ему не докладывает... так ты говори, с чем не согласен...

Каго і якіх льгот пазбавілі?

Ваенныя, супрацоўнікі органаў унутраных спраў, фінансавых расследаванняў, злучэнняў па надзвычайных сітуацыях і членаў іхніх сем'яў:

— бясплатнае прадастаўленне лекаў;

— бясплатны праезд у адпачынак.

Былыя вязні фашысцкіх канцлагераў, іншых месцаў прымусовага ўтрымання:

— бясплатныя лекі;

— бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў;

— бясплатны праезд у гарадскім і прыгарадным транспарце.

Ветэраны працы, грамадзяне пры выкананні службовых абавязкаў:

— 50-працэнтнае зніжэнне кошту праезду на пасажырскім транспарце.

Вучні і студэнты:

— 50-працэнтнае зніжэнне кошту праезду ў гарадскім і прыгарадным транспарце;

— 50-працэнтнае зніжэнне кошту праезду па краіне з 1 кастрычніка па 30 чэрвеня па суботах, нядзелях і святочных днях.

Дзеці да трох гадоў:

— бясплатныя лекі.

Дзеці-інваліды:

— 50-працэнтнае зніжэнне кошту білетаў за праезд па краіне.

Дзеці з тэрмінальнай стадыяй хранічнай нырачнай недастатковасці:

— штогадовая грашовая кампенсацыя выдаткаў на транспарт.

Людзі, што перанеслі прамянёвую хваробу і сталі інвалідамі 1—2-й груп у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС:

— бясплатныя лекі, якія выдаюцца па рэцэптах;

— бясплатны праезд ад месца жыхарства да месца лячэння;

— 50-працэнтнае зніжэнне аплаты паслуг жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

— беспрацэнтная пазыка на будаўніцтва жылля з пагашэннем 50 працэнтаў за кошт бюджэту.

Акрамя таго, абмежавана колькасць катэгорый асоб, якім прадастаўляюцца льготы па аплаце жыллёва-камунальных і медыцынскіх паслуг і паслуг сувязі.

Большасці існуючых сёння льгот пазбаўляюцца члены сем'яў льготніка, асабліва па аплаце жыллёва-камунальных паслуг і паслуг сувязі.

АТЫ-БАТЫ

Президент вооружает, министры против

Для бойцов подразделений специального назначения внутренних войск Министерства внутренних дел Беларуси закуплены машины с кондиционерами, поведал заместитель министра внутренних дел, командующий внутренними войсками МВД Беларуси генерал-майор Валерий Гайдукевич, сообщает "Интерфакс".

"Бойцы спецназа во время массовых мероприятий вынуждены продолжительное время находиться в спецтранспорте, поэтому для них закуплены автомобили с кондиционерами", — сообщил В.Гайдукевич. При этом он пояснил, что "в холодное время суток в автомобили будет подаваться теплый воздух, во время жары — холодный". Вот какая забота! А купили ли автобусы с кондиционерами, чтобы отвозить в школы маленьких сельских жителей?.. Денег, говорят, нет.

Рассказывая о программе перевооружения внутренних войск МВД Беларуси, В.Гайдукевич сообщил, что *"для всего личного состава ВВ МВД закуплены средства защиты — бронежилеты, щиты, наколенники, специальные шлемы, рации"*. *"Кроме этого, для военнослужащих ВВ, которые охраняют и конвоируют заключенных, закуплена крупная партия электрошокеров"*, — отметил замминистра.

"В 2006 году был полностью заменен парк автомашин, которые перевозят спецконтингент", — сообщил В.Гайдукевич.

"Для СОБРа (специальный отряд быстрого реагирования) закуплено новое снайперское оружие", — сказал он.

Отмечая хорошую оснащенность внутренних войск МВД Беларуси, В.Гайдукевич вместе с тем выразил сожаление в связи с тем, что "правительство не включило нас (внутренние войска МВД. — **Ред.**) в свою инвестиционную программу". *"Программа перевооружения внутренних войск включена в президентскую инвестиционную программу, а правительство сопротивляется и до сих пор не включило в свою инвестиционную программу"*, — сказал он.

Лилия ВОРОНОВА.

ВОПРОС РЕБРОМ

Наталья ПЕТКЕВИЧ: «Мой ребенок ходит в обычную поликлинику...»

"Народная воля" поинтересовалась у заместителя главы Администрации президента Натальи Петкевич, которая присутствовала в Овальном зале, отберут ли у чиновников льготы и привилегии, о которых говорил Дубовик?

— Разве лечкомиссия — это льгота? — удивилась Наталья Владимировна. — Лечкомиссия — это обычное медицинское учреждение, за услуги которой тоже нужно платить. Это обычная поликлиника. Кстати, дети и члены семей чиновников на учете в лечкомиссии не состоят. Меня уговаривают туда прийти — у меня просто нет на это времени. Мой ребенок ходит в обычную поликлинику, хотя я могу прикрепить его в лечкомиссию на платной основе.

По путевкам у нас тоже льгот нет — платим по полной программе. Спецобслуживания у нас нет. Магазин, который есть у нас в здании, — так там все дороже, мне возле дома дешевле купить, чем там. Бензин точно так же покупаем, как и все. У нас нет льгот. А все, что есть — заберите...

Владимир НАУМОВ: «То, что высокопоставленные чиновники якобы ездили на общественном транспорте, — это уже история!»

Как сотрудники МВД отреагировали на отмену льгот?
Этот вопрос "Народная воля" задала министру внутренних дел генерал-лейтенанту Владимиру Наумову.

— Я всегда был против льгот, — ответил Владимир Владимирович. — В моем понимании льготами всегда пользовались наиболее обеспеченные сотрудники МВД. А менее обеспеченные — практически никогда.

А то, что высокопоставленные чиновники якобы ездили на общественном транспорте — это уже история! Потому что сегодня, я думаю, процентов 70 сотрудников МВД имеют свой личный транспорт, и даже мало кто знает, сколько стоит проезд в автобусе.

Еще была такая льгота, как внеочередная или первоочередная установка телефона — ну это совсем смешно, какая сейчас нужна очередь для телефона? У нас к тому же есть корпоративный договор с "МТС" и "Velcom" о том, что мы платим полцены — это еще большая льгота, чем та, которую отменили! А все эти госпитали, санатории — это был удел высокопоставленных чинов, которые эти льготы и распределяли. Те, кто работал на местах, этого всего не видели. Поэтому лично я двумя руками за отмену льгот. Мои подчиненные даже и не заметят этого. А все те, кто действительно нуждается в бесплатном проезде, с нового года будут получать проездной билет, который будет приобретать для них МВД.

В ТЕМУ

Владимир ПОТУПЧИК: «К 2010 году средний размер пенсии будет составлять 476 тысяч...»

Во время обсуждения спорного законопроекта депутат **Николай Дубовик** задал вопрос министру труда **Владимиру Потупчику:** *"Довольно большая категория граждан Беларуси, получая зарплату, получает и пенсию, гораздо больше обычной пенсии по стране. И, как правило, эти граждане получают несколько видов льгот, наряду с этим они и члены их семей пожизненно обслуживаются в медицинских учреждениях. Может, надо было начать именно с них — чтобы они отказались от части своих привилегий? И тогда было бы не так обидно. Например, депутаты еще в бытность Верховного Совета 13-го Созыва отказались от всех своих льгот... И моя семья льгот не имеет. И даже я, когда уйду из этого зала, не буду наблюдаться в лечкомиссии..."*

Министр ответил как-то пространно и не по существу: *"Льготы должен получать только льготник. На всех остальных членов семей его льготы распространяться не должны. С точки зрения социальной справедливости это абсолютно верный подход. Главная задача государства сводится к тому, чтобы повысить уровень благосостояния наших людей через повышение реальных доходов населения. Например, к 2010 году средний размер пенсии будет составлять 476 тысяч..."*

Марина КОКТЫШ.

ТЫМ ЧАСАМ

Аляксандр Лукашэнка не бачыць прычын для ўзнікнення сацыяльных хваляванняў у сувязі з рашэннем кіраўніцтва краіны скасаваць некаторыя сацыяльныя льготы. *"У нас не паўсіцца ніякая сацыяльная тэмпература"*, — заявіў А.Лукашэнка. *"Пазбаўленне ад неабгрунтаваных ільгот у Беларусі — гэта не капрыз, а аб'ектыўная рэальнасць"*, — упэўнены ён.

ТРАГЕДЫЯ

Смерць у навальніцу

У нядзелю ў Мінску падчас навальніцы паваленым дрэвам была абарвана лінія электрапередачы. Токам ад праводу былі смяротна траўміраваны 45-гадовая жанчына і яе сын.

Пра гэта паведаміла група інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама. Праверку па дадзеным факце праводзіць пракуратура Цэнтральнага раёна сталіцы.

БелаПАН.

РЭГІЁН

У Гомелі плануюць устанавіць помнік дворніку

Як паведаміў галоўны мастак горада Леанід Мельнікаў, ідэю стварэння помніка падаў старшыня Гомельскага гарвыканкама Аляксандр Бяляеў.

Нядаўна быў завершаны адбор эскізаў будучай скульптуры. Конкурс выйграла самая маладая ўдзельніца, гамяльчанка Яна Канавалава. *"У сваім эскізе дзяўчына пайшла далей за звычайны вобраз дворніка, у яе гэта — маленькі добры чалавечак, гарадскі захавальнік. Каля ног дворніка сядзіць кот, на капелюшы — птушка. Скульптура заклікае да чысціні думак. Гледзячы на такога дворніка, мала ў каго ўзнімецца рука кінуць на тратуар паперку"*, — лічыць галоўны мастак.

Цяпер гарадскія ўлады шукаюць месца для скульптуры, каб навакольны фон гарманічна дапаўняў архітэктурную кампазіцыю. Помнік будзе адліты ў поўны рост з бронзы, яго плануецца адкрыць вясной 2008 года.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

ІНІЦЫЯТЫВА

Сяргей ЛУКАНІН:

«Далёка не ўсе ў Беларусі ведаюць, што адбываецца з правамі чалавека ў рэлігійнай сферы...»

Вось ужо на працягу месяца вернікі розных рэлігій збіраюць подпісы супраць закона Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях". Як сумна жартуюць некаторыя вернікі, згодна з дзеючым законам, калі ты збярэшся з сябрамі ў хаце выпіць гарэлкі, цябе ніхто чапаць не будзе, але калі вы будзеце чытаць Біблію, вас затрымаюць.

*Сітуацыю тлумачыць юрыст царквы "Новае жыццё", адначасова прэс-сакратар і каардынатар кампаніі па абароне правоў на свабоду сумлення **Сяргей ЛУКАНІН**.*

— Сяргей, раскажыце, калі ласка, як праходзіць кампанія па зборы падпісаў?

— Кампанія набірае досыць шпаркія абароты. Адразу хачу падкрэсліць, што гэта ініцыятыва не толькі нашай царквы. У кампанію ўваходзіць ужо больш за 60 цэркваў, у тым ліку пратэстанцкія і каталіцкія. Падключаюцца таксама асобныя грамадскія аб'яднанні. Актыўны ўдзел бяруць праваслаўныя вернікі, але гэта толькі асобныя людзі, а не прыходы. Я асабіста знаёмы з праваслаўнымі актывістамі, якія насамрэч з'яўляюцца сапраўднымі вернікамі, і актыўна ўдзельнічаюць у гэтай кампаніі. Таму што ўва ўсіх ёсць абсалютнае разуменне таго, што закон "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях", супраць якога мы зараз выступаем, змяшчае абмежаванні для любых рэлігій, не толькі для хрысціянскіх. Гэты закон складзены так, што дазваляе ўладзе і чыноўнікам кантраляваць не толькі цэрквы, прыходы як пэўныя структуры, але і асабістае жыццё вернікаў. Няма нічога больш асабістага ў жыцці кожнага чалавека, як стасункі з Госпадам. І гэты закон дае магчымасць кантраляваць гэтую асабістую, можна сказаць, інтымную сферу. Напрыклад, у 25-м артыкуле гэтага закона напісана, дзе можна маліцца, а дзе нельга. І атрымліваецца, што калі два чалавекі збяруцца, каб памаліцца ці пачытаць Біблію ў сваёй кватэры, то для гэтага яны павінны звярнуцца ў сваю царкву, каб царква ініцыявала зварот у выканкам, і выканкам будзе разглядаць пытанне, дазволіць ці не дазволіць гэтым вернікам сустрэцца ў іх жа кватэры. Гэта, канечне, не нармальна. І гэта толькі адзін са шматлікіх пунктаў, якія рэальна парушаюць як Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, так і некаторыя іншыя прававыя акты, якія рэгулююць сферу правоў чалавека.

— Чаго вы намагаецеся дасягнуць?

— Мы абвяшчаем аб жаданні сабраць не менш як 50.000 подпісаў грамадзян Беларусі для накіравання звароту ў Канстытуцыйны суд. Гэтым мы хочам выявіць волю значнай часткі беларусаў, звярнуць увагу ўлад на несупадзенні асобных палаженняў закона з Канстытуцыяй. Бо так далей працягвацца не можа.

Другая мэта — гэта асветніцтва. Ход кампаніі дазваляе гаварыць пра тое, што актывісты нясуць асвету нашаму грамадству. Таму што далёка не ўсе ў Беларусі ведаюць, што адбываецца з правамі чалавека ў рэлігійнай сферы, які закон у нас дзейнічае сёння, што ў ім дрэннага, што добрага (калі ёсць нешта добрае). І для большасці людзей, якім прапаноўваюць паставіць свой подпіс, гэта інфармацыя становіцца адкрыццём. Усе здзіўляюцца, што ў нашай краіне ў XXI стагоддзі дзейнічаюць законы пачатку XX стагоддзя. Гэта можна параўнаць з даваенным перыядам савецкай гісторыі, часамі нейкага глыбокага цемрашальства.

На пачатку кампаніі мы не чакалі, што людзі будуць актыўна ў ёй удзельнічаць, падпісваць лісты. Я быў упэўнены, што нашы людзі недастаткова актыўныя для таго, каб увогуле ўдзельнічаць ў нейкай акцыі. Тым больш калі гаворка ідзе пра тое, каб паставіць свой подпіс супраць існуючага закона. Я думаў, што 15—20 працэнтаў апытаных людзей будуць ставіць свае подпісы. Але ў нас зусім іншая статыстыка. Каля 60 працэнтаў ставяць свае подпісы супраць гэтага закона. І калі мы збяром 50.000 подпісаў, то дасягнём колькасці прыкладна ў 100—120 тысяч чалавек, якія будуць апытаны і праінфармаваны.

Ёсць яшчэ трэцяя мэта. Гэта павышэнне актыўнасці і аб'яднанне хрысціян. Бо сёння, на жаль, нельга казаць пра нейкую еднасць. Але кампанія ўжо зараз дае пэўны плён. З'яўляюцца дадатковыя нагоды для стасункаў паміж свяшчэннаслужыцелямі, рознымі цэрквамі і іх вернікамі.

— Колькі ўжо подпісаў сабрана?

— Сёння мы можам гаварыць пра 15.000 сабраных подпісаў. Гэта вельмі нядрэнны вынік, таму што кампанія працягваецца ўсяго адзін месяц. Гэта адна з самых выніковых кампаній у Беларусі за апошні час. У ёй удзельнічаюць больш за 35 буйных гарадоў Беларусі і непадлічаная колькасць мястэчкаў і вёсак. Але кампанія працягваецца, і гэта не канчатковы вынік.

Паўліна ВОЙЦІЧ.

ДАРЭЧЫ

27 мая быў затрыманы пастар "Царквы Ян Прадвеснік" Антось Бакун.

Царква не мае свайго будынка, таму Вялікае свята Святой Тройцы было вырашана адслужыць дома ў самога пастара, аб чым Бокус паведаміў загадзя ў гарвыканкам. Падчас служэння ў дом увайшлі 10 міліцыянтаў і на вачах жонкі і трох дзяцей забралі Антося Бакуна ў аўтазак.

На наступны дзень стала вядома, што суд абвінаваціў Антося Бакуна ў арганізацыі несанкцыянаванага набажэнства. Яго аштрафавалі на 620 тысяч беларускіх рублёў.

Разам з Антосем Бакуном за рэлігійную дзейнасць падвергся пераследу яшчэ адзін служыцель гэтай жа царквы, польскі грамадзянін Яраслаў Лукасік, які ўжо 14 год жыве ў Беларусі. Яго абвінавацілі ў пагрозе нацыянальнай бяспецы і загадалі тэрмінова пакінуць тэрыторыю Беларусі. У Яраслава Лукасіка ёсць жонка і трое дзяцей з беларускім грамадзянствам. У сям'і размаўляюць па-беларуску, дзеці выхоўваюцца на беларускай культурнай спадчыне. У выніку абвінавачвання сям'я можа быць парушана, ці жонцы з дзецьмі прыйдзецца з'язджаць за мяжу. Гэта не першы і не адзіны выпадак рэпрэсій у адносінах да свяшчэннаслужыцеляў. З канца мінулага года па сённяшні дзень з краіны высланы больш за 25 замежных місіянераў. Большасць з іх абвінавачвалі ў дзейнасці, якая пагражае нацыянальнай бяспецы Беларусі.

Народная Воля http://www.nv-online.info
31 МАЯ 2007 г.

ЛІКБЕЗ

Дарагі Іосіф Паўлавіч!

Найперш дазвольце Вам яшчэ раз падзякаваць за "Народную волю" — газету, якую ў Малым Сітне перадаюць з рук у рукі і чытаюць на перакурах у леспрамгасе. Сярод тых, з кім мы перапісваемся, больш за 100 чалавек даведаліся пра мой адрас менавіта праз вашу газету — і ў выніку мне пашчасціла пазнаёміцца з цудоўнымі людзьмі, шчырымі беларусамі.

Іосіф Паўлавіч, 25 мая спаўняецца (ужо споўнілася. — Рэд.) 90 гадоў з дня заснавання адной з першых беларускіх палітычных партый — Хрысціянскай Дэмакратычнай злучнасці. З іншага боку, зараз пачынаецца актыўная дзейнасць па стварэнні Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі — партыі, якая мусіць працаваць з вернікамі ўсіх хрысціянскіх канфесій. Напісаў з гэтай нагоды артыкул — і вельмі спадзяюся, што Вам і чытачам Вашай газеты ён будзе цікавы.

З вялікай павагай і ўдзячнасцю, з зычаннем волі, веры і Божае ласкі.

Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя

Увесну 1917 года, на хвалі лютаўскай рэвалюцыі, 30 маладых каталіцкіх святароў на сходзе ў катэдральным касцёле ў Мінску абвясцілі, што будучыня Беларусі — за дэмакратыяй, збудаванай на хрысціянскіх прынцыпах. Шырокаму чытачу мала вядома пра погляды і гісторыю беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху — хаця ў большасці краін Еўропы хадэкі з'яўляюцца палітычнай сілай першай велічыні. Зараз яны ва ўладзе ў Нямеччыне, Польшчы, Чэхіі, Швецыі; Хрысціянска-дэмакратычнай ёсць Рэспубліканская Партыя ЗША (асноўная партыйная структура так і называецца — "Хрысціянская кааліцыя"); хрысціянска-дэмакратычныя ідэі спавядаюць і новаабраны прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі, і папулярная ва Украіне Юлія Цімашэнка. У пасляваенныя гады XX ст. менавіта хрысціянская дэмакратыя сталася рухавіком адраджэння Еўропы і ініцыятарам еўраінтэграцыі. Беларусі, якая перажывае глыбокі крызіс каштоўнасцяў, востра нестае якраз такой еўрапейскай стваральнай ідэі, заснаванай на маральнасці і патрыятызме, моцным мясцовым самакіраванні і адказнасці. Невыпадкова ўдзельнікі сёлетніх Дня Волі і "Чарнобыльскага Шляху" звярнулі на гэта ўвагу, сцяг з надпісам "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" залуналі на сталічных вуліцах упершыню.

Хрысціянская Дэмакратычная злучнасць

Заснаванне ХДЗ у 1917 годзе было з'явай заканамернай і наспелай. Разгортванне нацыянальнага руху ў эпоху сусветных войнаў і рэвалюцый вымагала ад беларусаў кшталтавання палітычнай ідэалогіі, здольнай супрацьстаяць і камунізму, і анархізму, і фашызму. Пашырана меркаванне, што беларускім адказам на выклікі XX ст. стаў сацыялізм Беларускай Сацыялістычнай Грамады, а пазней, у Заходняй Беларусі, — Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Але тым часам існавала і іншая палітычная альтэрнатыва, сфармуляваная ў тым самым лёсавызначальным 1917-м — Хрысціянская дэмакратыя.

Беларускі Хрысціянска-дэмакратычны рух узнік на пачатку XX стагоддзя ў асяроддзі слухачоў Пецярбургскай духоўнай акадэміі ды Віленскай духоўнай семінарыі. Менавіта заснавальнікі ХДЗ зрабіліся лідэрамі беларускага нацыянальнага руху 1920—1940 гг., і ахвяравалі сваімі жыццямі за волю Бацькаўшчыны: ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, кіраўнік беларускага незалежнага падполля падчас гітлераўскай акупацыі, расстраляны гестапаўцамі ў Трасцянцы; ксёндз Адам Станкевіч, аўтар кнігі "Хрысціянства і беларускі народ: спроба сінтэзы", старшыня Таварыства Беларускай Школы ў Заходняй Беларусі, забіты ў ГУЛАГу; архімандрыт Фабіян Абрантовіч, закатаваны ў Маскоўскай Бутырскай турме; Ян Пазьняк — дзед праваднра БНФ Зянона Пазьняка, таксама рэпрэсаваны энкавэдзістамі... У той жа самы час сярод праваслаўных хрысціянска-дэмакратычную пазіцыю падтрымлівалі прыхільнік Беларускай Аўтакефальнай Царквы мітрапаліт Мельхісэдэк (Раеўскі), расстраляны бальшавікамі ў 1920-х гг., і сябры Праваслаўнага Беларускага Дэмакратычнага Аб'яднання, а сярод пратэстантаў — пастар найбуйнешай ва Усходняй Еўропе баптысцкай грамады і перакладчык на беларускую мову Новага Запавету Лукаш Дзёкуць-Малей.

Пасля Рыжскага міру, калі ў падсавецкай Усходняй Беларусі царква была выкараненая, а беларускія дзеячы кінутыя ў турмы, — у Заходняй Беларусі Хрысціянская дэмакратыя стала адной з галоўных палітычных сіл. Праз 10 гадоў, 6 лістапада 1927 г., у Вільні хадэцкія актывісты, што гуртаваліся вакол выдаванай Адамам Станкевічам газеты "Беларуская Крыніца", правялі ўстаноўчы сход партыі "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя". "Мы, хрысціяне, а знача — дэмакраты. Хрысціянін не можа не быць дэмакратам, бо хрысціянства прызнае і шануе людскія правы кожнай адзінкі і кожнага народу, а также брацтва людзей і народаў", — сцвярджалася ў праграме партыі. Менавіта БХД, пераняўшы эстафету ад БНР, у міжчассі двух сусветных войнаў адстойвала тыя каштоўнасці, якія пазней уздымуць на сцяг БНФ і Рух "За Свабоду!" — незалежнасць, свабоду, праўду, справядлівасць і духоўнае Адраджэнне.

Паглынанне Савецкім Саюзам Заходняй Беларусі, вайна ды сталінізм перапынілі традыцыю хрысціянскай дэмакратыі да канца XX ст. На пачатку 1990-х у віры нацыянальнага руху ў Беларусі ўзнікла адразу некалькі хрысціянска-дэмакратычных партый: Беларуская Хрысціянска-Дэмакратычная Злучнасць, Хрысціянска-Дэмакратычны Выбар, Беларуская Хрысціянска-Дэмакратычная Партыя... Праўда, спрабуючы заняць палітычную нішу, гэтыя партыйныя ўтварэнні не здолелі здабыць шырокай падтрымкі вернікаў ды патрыётаў і засталіся хутчэй знакам запатрабаванасці самой хрысціянска-дэмакратычнай ідэі ў Беларусі.

Глыбока беларуская ідэя

І насамрэч, хрысціянская дэмакратыя — ідэя для Беларусі глыбока гістарычная.

Вядома, што тысячу гадоў існавання беларускай дзяржаўнасці адметныя імкненнем да народаўладдзя. Полацкае веча, што запрашала і скідала князёў; шляхецкая дэмакратыя пры выбарным валадары і строгі падзел галінаў улады ў Вялікім княстве Літоўскім, забяспечаны знакамітым Статутам; Магдэбургскае права; Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. (другая ў свеце пасля амерыканскай, дзе пад грамадзянамі краіны меліся на ўвазе ўсе яе жыхары, а не прадстаўнікі пэўных саслоўяў); устаноўчыя граматы Беларускай Народнай Рэспублікі; парламенцкая Рэспубліка Беларусь 1991—1994 гг., і цэлая плеяда лідэраў, што вялі да дэмакратыі іншыя народы — Касцюшка, Дамейка, Мінейка, Судзілоўскі, Адамовіч, Старавойтава, Навадворская, Кавалёў — сведчанняў багата.



Разам з тым пачынаючы яшчэ з часоў Ізяслава і Еўфрасінні Полацкай светапоглядным, каштоўнасным падмуркам для беларускага народаўладдзя было *хрысціянства*. Шматканфесійнае, талерантнае, ахвярнае, яно вызначала першаснасць духоўнасці, сумленнасці, справядлівасці ў палітыцы.

Дастаткова працытаваць лідэраў беларускай гісторыі, каб убачыць, наколькі пахрысціянску разумелі яны ўладу народа:

"У Біблії ўсе законы і правы, якімі людзі на зямлі кіравацца маюць, напісаныя... Тут справа ўсякага збору людскога і ўсялякага гораду выкладаецца, каб вераю, яднаннем ласкі й згоды паспалітае памножана была" (Францішак Скарына).

"А калі ёсць рознасць немалая ў веры хрысціянскай, абяцаем сабе за нас, за нашчадкаў нашых, на вечныя часы, пад абавязкам прысягі, пад вераю, годнасцю і сумленнем нашым, каб тыя, хто розныя ў веры, спакой між сабой захавалі" (Са статута ВКЛ 1588 г., рэдагаванага Львом Сапегам).

"Бог стварыў чалавека, каб ён карыстаў з вольнасці справядлівай" (Кастусь Каліноўскі).

"Беларусь павінна вярнуцца да Хрысціянства. Беларусь у XXI стагоддзі мусіць адрадзіцца як Хрысціянская краіна. Беларуская ідэя, абапертая на традыцыі беларускага Хрысціянства, — гэта шлях для нас найбольш універсальны і правільны" (Зянон Пазьняк).

Увогуле, сама беларуская нацыянальная ідэя унікальна хрысціянская ў сваёй сутнасці. Беларуская культура, напоеная евангельскім святлом. Беларуская рэлігійная традыцыя. Беларуская місія ў свеце — наследаванне Хрысту і апосталам, і вечны беларускі крыж — пакуты і ахвяраванне за іншых. Нарэшце, большасць беларускіх нацыянальных герояў — вернікі. Яскрава сведчаць пра гэта і сімвалы беларускага дэмакратычнага руху: бел-чырвона-белы сцяг — палатніна з крывёю ўкрыжаванага і ўваскрослага Збаўцы, герб "Пагоня" з крыжам Еўфрасінні, гімн "Магутны Божа", які спяваюць у храмах усіх канфесій.

Такім чынам, і абвяшчэнне ХДЗ у 1917 г., і стварэнне БХД у 1927 г., і яе аднаўленне цяпер — выяўленне глыбіннай светапогляднай плыні, што ўвесь час жывіла беларускае Адраджэнне.

Што такое хрысціянская дэмакратыя

Што ж уяўляе сабою ідэя хрысціянскай дэмакратыі?

Гісторыя хрысціянства, як і ідэя дэмакратыі, налічвае шмат стагоддзяў. І хаця многія паспяховыя палітычныя феномены — Чэхія XV ст., ВКЛ XVI ст., Галандыя XVII ст. ці ЗША канца XVIII ст. — мелі хрысціянска-дэмакратычны характар, як самастойная палітычная ідэалогія хрысціянская дэмакратыя была сфармуляваная ў XIX ст. Крывавая французская рэвалюцыя і імклівая секулярызацыя, што разбурала асновы маралі, з аднаго боку, і прызнанне грамадзянамі ўсіх жыхароў, незалежна ад сацыяльнага і маёмаснага статусу, з іншага, паставілі пытанне аб найбольш адпаведнай хрысціянскаму ідэалу палітычнай альтэрнатыве ліберальнаму капіталізму ды радыкальнаму сацыялізму. Найважнейшыя палажэнні хрысціянскай дэмакратыі былі распрацаваныя каталіцкімі ідэолагамі і сістэматызаваныя ў папскіх энцыкліках Ільва XIII "Rerum novarum" і Пія XI "Quadragesima Amo". І чым мацнейшыя катастрофы скаланалі чалавецтва за апошнія два стагоддзі — крызісы капіталізму, марксісцкія рэвалюцыі, таталітарныя рэжымы, сусветныя войны, тым больш запатрабаванай ды папулярнай рабілася хрысціянская дэмакратыя. Нарэшце, пасля 1945 г. пачаўся сапраўдны бум: хадэкі прыйшлі да ўлады ў Нямеччыне, Аўстрыі, Італіі, Лацінскай Амерыцы, распачалі еўрапейскую інтэграцыю і істотна ўдасканалілі саму мадэль дэмакратыі.

У палітычным спектры хрысціянская дэмакратыя займае месца, найбольш блізкае да "залатой сярэдзіны" паміж кансерватызмам, лібералізмам і сацыял-дэмакратыяй: калі ў Еўропе класічныя хадэкі — правацэнтрысты (выступаюць за абмежаванне ролі дзяржавы на карысць грамадства, вольны рынак, патрыятызм), дык у Лацінскай Амерыцы Хрысціянска-дэмакратычныя партыі нярэдка прадстаўляюць левы цэнтр (узмацненне ролі дзяржавы, ідэі сацыяльнай справядлівасці).

Калі сцісла, хрысціянская дэмакратыя — гэта прыўнясенне хрысціянскіх маральных прынцыпаў у палітыку, эканоміку, сацыяльную галіну, культуру, адукацыю — любую сферу жыцця, з якой сутыкаецца кожны чалавек.

Ядро сістэмы хрысціянска-дэмакратычных каштоўнасцяў складае трыяда паняццяў: Бог, Чалавек, Бацькаўшчына. Асноўныя прынцыпы хрысціянскай дэмакратыі:

— Маральнасць — абавязак грунтаваць свае дзеянні на хрысціянскіх ідэалах.

— Адказнасць — імкненне браць на сябе клопат аб стане грамадства, уласным лёсе і дабрабыце сям'і.

— Субсідыярнасць — пастанова прымаць рашэнні на тым узроўні, на якім яны найбольш эфектыўна выконваюцца: дэцэнтралізацыя дзяржаўнай улады і садзейнічанне сям'і, прафесійным групам, мясцовым хрысціянскім супольнасцям і мясцоваму самакіраванню.

— Персаналізм — сутнасна хрысціянская раўнавага паміж індывідуалізмам і калектывізмам, якая надае першачарговую ўвагу унікальнай асобе і невялікім супольнасцям.

— Салідарнасць — пачуццё ўзаемадапамогі, якое праймае ўсе пласты грамадства, паразуменне багатага з бедным, прыярытэт нацыянальнага дабра, які робіць магчымым поўнавартаснае развіццё і нацыі, і чалавецтва.

Хрысціянская дэмакратыя — адзіная палітычная ідэалогія, якая базуецца на біблейскіх, евангельскіх прынцыпах, дадзеных чалавеку Богам.

Тут і цяпер

І ў цяперашняй Беларусі ўмовы дзяржаўнай залежнасці, задушэння дэмакратыі і грамадскага заняпаду вымагаюць моцнай ідэйнай праграмы нацыянальнага, палітычнага і духоўнага адраджэння, і яснага адказу на пытанні: "А што замест?", "Што пасля?".

На змену папулісцкай аўтарытарнай дыктатуры, што трымаецца на хлусні, страху, нянавісці, мусіць прыйсці сапраўднае народаўладдзе з крышталёвай правасвядомасцю, прынцыповай адказнасцю і хрысціянскай маральнасцю. Перамагчы рэжым і прычыны, што яго спарадзілі, магчыма, толькі аднаўляючы разбураную законнасць і незалежнасць, культывуючы патаптаную любоў да Радзімы і блізкага, супрацьстаючы разгулу алкагалізму, крыміналу, разбэшчанасці, гвалту ды цынізму, падтрымліваючы ўціскане зараз царквы і выключна важную ў эпоху дэмаграфічнага крызісу сям'ю. Агульнанацыянальнае *пакаянне,* магутная *вера* як рухавік перамен, духоўны ўздым, здольны знішчыць апатыю і абыякавасць — вось першачарговыя задачы палітычнага лідэрства ў сучаснай Беларусі.

Ва ўсім свеце з падобнымі задачамі найлепш спраўляюцца менавіта хрысціянскія дэмакраты. Ключавая перавага хадэкаў — у іхняй стаўцы на сумленнасць і адказнасць.

Вядома, з якім расчараваннем сутыкнуліся нашы суседзі. Расія і Украіна ў выніку правядзення дэмакратычных рэформ. Карупцыя, маёмаснае расслаенне. Паводка распусты. Алігархія. Абсалютна відавочна: каб пазбегнуць падобных правалаў пераходнага перыяду, трэба ўжо зараз закладаць у беларускай палітыцы трывалы падмурак духоўных каштоўнасцяў. Таму найпершым прынцыпам і працы сённяшняга нацыянальнага руху, і правядзення будучых рэформ трэба лічыць празрыстасць, адкрытасць і маральнасць.

Калі Беларусь і патрабуе рэвалюцыі — дык *рэвалюцыі сумлення.* Яшчэ раз падкрэслім: у першую чаргу не рэвалюцыі адплаты, прагматызму ці класавай нянавісці — сумлення!

Дзе ж узяць столькі сумленных, руплівых, дысцыплінаваных супрацоўнікаў? Галоўныя рэзервы чыстай, этычнай палітыкі, амаль не задзейнічаныя сённяшнім беларускім дэмакратычным рухам, знаходзяцца ў хрысціянскіх грамадах. Менавіта вернікі, якіх так нестае ў сучаснай палітыцы, — будучыня беларускай дэмакратыі.

Больш таго, масавая хрысціянская дэмакратыя сёння пакліканая стаць сапраўдным прарывам нацыянальнага адраджэння. Уся тысячагадовая моўная і культурная традыцыя, ментальнасць і падсвядомасць беларусаў узгадваліся і выспелі на Евангеллі і веры ў Бога — і беларусізацыя касцёла, пратэстанцтва і нацыянальнага праваслаўя, асабліва сярод моладзі, ужо яўна апярэджвае падобныя працэсы ў астатнім грамадстве.

Чалавек моцнай веры, поўны любові, прафесійны і адказны — вось вобраз беларуса XXI стагоддзя, пакліканага пераадолець сённяшні ўціск рэжыму, духоўны застой, заняпад гаспадаркі ды ўсе пагрозы "эпохі перамен".

Адраджэнне хрысціянскай дэмакратыі

Невыпадкова якраз новае пакаленне беларускага нацыянальнага руху зноў падымае сцяг хрысціянскай дэмакратыі. У Арганізацыйны камітэт па стварэнні Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, заснаваны ў Мінску, увайшлі пераважна маладыя патрыёты Беларусі і вернікі ўсіх канфесій — праваслаўныя і каталікі, пратэстанты і уніяты. Сярод спадкаемцаў Адама Станкевіча і Вінцэнта Гадлеўскага — палітыкі новай хвалі Аляксей Шэін і Віталь Рымашэўскі, прадпрымальнік Георгій Змітрук і юрыст Мікалай Арцюхоў, легендарны святар, вязень ГУЛАГу і пастар Беларускай Евангельскай Царквы Эрнэст Сабіла, гісторык Алесь Белы і бард Андрэй Мельнікаў, арганізатар намётавага лагера на плошчы Каліноўскага Вячаслаў Сіўчык, рэжысёр Андрэй Расінскі, акцёр Павел Харланчук, маладзёжныя лідэры Зміцер Дашкевіч, Зміцер Хведарук і Барыс Гарэцкі.

Аргкамітэт гуртуе аднадумцаў ужо больш як у 30 гарадах Беларусі і рыхтуе ўстаноўчы з'езд БХД. Хрысціянскія дэмакраты сумесна з евангельскімі цэрквамі пры ўдзеле праваслаўных і каталіцкіх святароў распачалі кампанію за змену рэпрэсіўнага "Закона аб свабодзе сумлення" (ужо сабрана больш за 10.000 подпісаў); пачалі аказваць дапамогу героям веры, пацярпелым ад бальшавіцкіх рэпрэсій, ладзіць адукацыйныя сустрэчы і мясцовыя акцыі.

На першым этапе сваёй дзейнасці Аргкамітэт БХД ставіць задачу наладзіць узаемадзеянне з усімі хрысціянскімі супольнасцямі і грамадскім актывам у краіне, правесці шэраг кампаній у абарону законнасці і маралі, нацыянальнага і духоўнага адраджэння. А стратэгічная мэта БХД — ператварыцца ў вядучую палітычную сілу Беларусі.

Інфармацыю пра дзейнасць Аргкамітэта, праекты праграмных дакументаў і акцыі можна атрымаць праз сайт www.bchd.info або тэлефоны каардынатараў: 763-59-54 (Віталь) і 651-26-65 (Аляксей).

...Тое, што адбылося ў Мінскім Катэдральным касцёле 90 гадоў таму, было толькі пачаткам. Цяпер надыходзіць час не проста пратэстнай апазіцыі — а стваральнай, сутнасна беларускай, сумленнай і дзейснай альтэрнатывы. Такой, якая б будавала ў сэрцы Еўропы новую краіну.

Беларускую. Хрысціянскую. Дэмакратыю.

Павел СЕВЯРЫНЕЦ.

в.Малое Сітна.

P.S. *Артыкул быў напісаны да вызвалення П.Севярынца з "хімії".*

З-ЗА КРАТАЎ

Клімаў у бальніцы

У мінскім следчым ізалятары №1 пацвердзілі інфармацыю аб тым, што палітык Андрэй Клімаў адпраўлены ў рэспубліканскую турэмную бальніцу.

Нагадаем, што былы дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання скардзіўся на галаўныя і сардэчныя болі. Доўгі час у ізалятары палітыку не аддавалі лекі, якія яму перадалі сваякі. Маці палітвязня, Ала Клімава, двойчы звярталася да міністра аховы здароўя Васіля Жарко з просьбай аб тэрміновай шпіталізацыі сына.

Нагадаем, Андрэй Клімаў ужо трэці раз знаходзіцца за кратамі. Упершыню ён быў асуджаны на 6 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму ў 1998 годзе за фінансавае махлярства, аднак вызваліўся ў 2002 годзе.

У 2005 г. яго асудзілі на паўтара года за арганізацыю акцыі пратэсту супраць Аляксандра Лукашэнкі. На волю ён выйшаў у снежні мінулага года, але сёлета ў красавіку палітыка арыштавалі за паклёп на прэзідэнта. Падставай для гэтага стаў артыкул Клімава, размешчаны ў Інтэрнеце, у якім палітык напісаў пра асабістую датычнасць Лукашэнкі да выкраданняў і забойстваў лідэраў беларускай апазіцыі.

Лілія ВОРАНАВА.

ОФИЦИАЛЬНО

И вновь амнистия

Закон об амнистии будет внесен в парламент в течение 2—3 недель, сообщил министр внутренних дел Беларуси Владимир Наумов.

"Амнистия коснется всех граждан, которые совершили преступление по неосторожности, а также граждан, совершивших некоторые категории нетяжких преступлений", — уточнил министр.

По предварительной оценке, согласно проекту закона, в результате амнистии выйдут на свободу до 3 тысяч человек. Кроме того, амнистия коснется 7 тысяч человек, чье наказание не было связано с лишением свободы, уточняет "Интерфакс".

ТРАГЕДЫЯ

Сябра Партыі БНФ знойдзены забітым

У Жлобіне на тэрыторыі складоў мясцовага прадпрыемства "Аграгандаль" знайшлі цела сябра Партыі БНФ Аркадзя Ліскаўца. У яго быў моцна пабіты твар і праламаны чэрап.

Спадару Ліскаўцу ў студзені гэтага года споўнілася 53 гады. Ён быў жанаты, выгадаваў з жонкаю Людмілай дваіх дзяцей, цешыўся з унука.

Як спецыяліст з універсітэцкай адукацыяй, Аркадзь Ліскавец да нядаўняга часу працаваў у "Аграгандлі" эканамістам. Аднак крыху больш за тыдзень таму дырэкцыя гандлёвага прадпрыемства перавяла спадара Ліскаўца ў вартаўнікі.

Аркадзя Ліскаўца ў пятніцу пахавалі на могілках ў Рэчыцы.

Ігар МАКАРАЎ.

ВІНШУЕМ!

Трайное шчасце на дваіх Лапцінскіх

Адразу шматдзетнай стала віцебская сям'я Лапцінскіх. Гэта здарылася пасля таго, як 33-гадовая **Іна ЛАПЦІНСКАЯ** з удзелам цэлага "экіпажу" медыкаў аддзялення паталогіі цяжарнасці гарадской клінічнай Бальніцы хуткай дапамогі нарадзіла траіх дзяцей — хлопчыка вагой 2430 г і дзвюх дзяўчынак (2280 і 2030). Загадчыца аддзялення **Вольга Платонава** прызналася, што за 20 год сваёй практыкі ўпершыню сустрэлася з такой цярплівай і самаадданай парадзіхай, як Іна Лапцінская. Маладая мама ўзорна выконвала ўсе рэкамендацыі ўрачоў і мужна перанесла неабходную аперацыю, даказаўшы, што і жанчына "бальзакаўскага ўзросту" можа дачакацца найвялікшага шчасця — стаць маці. А ў дадзеным выпадку — нават шматдзетнай маці.

Пасля выпіскі Іны з немаўлятамі з бальніцы радасны бацька павёз усю сям'ю ў загадзя набытую і абстаўленую трохпакаёўку. А наступным днём Ігар Лапцінскі пачаў шукаць для сваіх дзетак дасведчаную нянечку, бо разумее, што адной Іне цяжкавата будзе даглядаць адразу траіх — Уладзіслава, Мілену і Аліну.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ДЫПКУР'ЕР

Масавы ад'езд

На афіцыйным сайце Арганізацыі бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе (АБСЕ) з'явілася паведамленне пра вакантную пасаду кіраўніка мінскага офіса гэтай арганізацыі.

Цяперашні кіраўнік офіса шведскі дыпламат Аке Петэрсан паведаміў, што ён неўзабаве з'язджае з Мінска і будзе далей працаваць у Кіеве — прадстаўніком Савета Еўропы ва Украіне.

Спадар Петэрсан працуе ў Беларусі менш за два гады. Ён быў трэцім кіраўніком установы АБСЕ ў Мінску пасля нямецкіх дыпламатаў Ханса-Георга Віка ды Эберхарда Хайкена.

Дарэчы, у бліжэйшы час у сувязі са сканчэннем тэрміну знаходжання ў нашай краіне Беларусь пакінуць пасол Англіі Кенет Бенет і Германіі Марцін Хекер. Пасол Германіі заявіў, что ён спадзяецца ўбачыць на волі Аляксандра Казуліна яшчэ да свайго ад'езду напрыканцы чэрвеня.

Алег СНОЎ.

НАВІНКА

Паліва з водарам дранікаў

Прыемны, сямейны пах смажаных дранікаў адчуваецца сёлета ў час сяўбы на веснавых палетках сельгаскааператыва "Навасёлкі—Лучасі" (былога калгаса імя Суворава) Пастаўскага раёна. Тут упершыню ў Беларусі навучыліся рабіць паліва з рапсу і запраўляць ім дызельныя рухавікі.

Так здзейснілася мара старшыні гаспадаркі, Героя Сацыялістычнай Працы **Алега Валадзько** — перавесці тэхніку на таннае мясцовае паліва, як гэта не першы год робіцца ў ашчадных капіталістаў Заходняй Еўропы, дзе паспяхова выкарыстоўваюць рапсавы алей у якасці аднаго з кампанентаў дызельнага паліва.

Валадзько марыў дамагчыся большага — прымусіць трактары працаваць на чыстым рапсавым алеі. Мара нарадзілася 10 год таму, але толькі цяпер, пасля шэрагу эксперыментаў, пераабсталяваны тутэйшымі слесарамі колавы трактар МТЗ рушыў па раллі, пакідаючы за сабой выхлапны дымок з пахам бульбяных аладак.

Старшыня кааператыву крочыў побач з трактарам і ззяў, як чэмпіён свету...

Алег Адольфавіч і ў савецкія часы, і пазней не даваў сумаваць землякам і раённаму начальству. То ён уздымаўся ў паветра на мотадэльтаплане, каб пераканаць малавераў, што гэтак зручней і танней апрацоўваць пасевы гербіцыдамі або ўносіць хімічныя ўгнаенні, то будаваў зімовыя памяшканні для жывёлы з прасаванай саломы або выразаных са снегу "цаглін", то браўся (і паспяхова!) за вырошчванне афрыканскіх страусаў.

Таму нікога асабліва не здзівіла новае захапленне славутага "дзівака" і руплівага гаспадарніка. Праўда, не ўсе падтрымлівалі ідэю замены дызпаліва рапсавым алеем. Але на фоне росту коштаў на энерганосьбіты адкрыта змагацца супраць наватара чыноўнікі пабаяліся.

У выніку гаспадарка абзавялася цэхам па вытворчасці рапсавага алею, дзе працуе набытае за мяжой, але палепшанае вясковымі майстрамі абсталяванне.

Зварщчык Васіль Міхалькоў і слесар Пятро Ясінскі не без гордасці паказваюць прыезджым справу сваіх рук — удасканаленую сістэму ачысткі рапсавага паліва, дадатковы бункер і цэнтральны пульт кіравання вытворчасцю, аснашчаны камп'ютэрнай сістэмай кантролю тэхналагічнага працэсу.

Цэх пакуль што выдае 130 кг алею за суткі, але пры неабходнасці ягоную магутнасць можна павялічыць у чатыры разы.

— Відаць, давядзецца павялічваць, — гаворыць Алег Валадзько, — бо тэхніка на рапсавым алеі працуе не горш, чым на салярцы...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
31 МАЯ 2007 г.

НАКАНУНЕ

«Восьмерка» поговорит

Канцлер Германии **Ангела МЕРКЕЛЬ** выступила в бундестаге с правительственным заявлением по поводу предстоящего саммита "группы восьми". Главными темами встречи Меркель считает стабилизацию мирового экономического роста, защиту интеллектуальной собственности, либерализацию мировой торговли, а также придание процессу глобализации "человеческого лица".

Канцлер заявила, что с пониманием относится к критике, которую выражают уже в преддверии встречи антиглобалисты. Она подчеркнула, что мирные протесты против саммита не только легитимны, но и будут учтены участниками переговоров. Одной из центральных задач "группы восьми" Меркель считает придание процессу глобализации "человеческого лица". Необходимо создать условия для того, чтобы люди во всем мире могли жить достойно.

Главными политическими темами саммита в Хайлигендамме станут ближневосточный конфликт и иранская атомная программа. Правительство Ирана Меркель призвала выполнить требования международного сообщества. В противном случае Совбез ООН *"продолжит предпринимать решительные действия"*. В необходимости последнего канцлеру, правда, еще предстоит убедить Владимира Путина. Россия наряду с Китаем по-прежнему отказывается поддержать всесторонние санкции против Тегерана.

«Сор из избы» Назарбаева

Телекомпания "КТК" и еженедельник "Караван", принадлежавшие Рахату Алиеву, зятю президента Казахстана Нурсултана Назарбаева, прекратили свое существование. Сообщается, что эти меры приняты в связи с тем, что они нарушали законодательство страны. Об этом сообщает Би-Би-Си.

За день до закрытия телекомпании и газеты МВД Казахстана возбудило уголовное дело в отношении Алиева, обвиняя его в похищении в январе 2007 года руководителей "Нурбанка" Абилмажена Гилимова и Жодаса Тимралиева. Рахат Алиев является совладельцем этого банка. По словам главы пресс-службы МВД республики Багдата Кожахметова, расследование дела ведется по личному распоряжению президента Назарбаева.

Алиев является мужем старшей дочери президента страны Дариги Назарбаевой и до недавнего времени считался одним из самых влиятельных людей в стране.

Сам Алиев отрицает свою вину. Он выступил с заявлением, в котором обвинил Нурсултана Назарбаева в политическом преследовании, и объяснил это своим намерением баллотироваться на высший пост в государстве в 2012 году, когда истекают полномочия действующего главы республики. По утверждению Алиева, родственник не простил ему этого; все, что теперь происходит вокруг "Нурбанка" и вокруг него самого, следует рассматривать в этом контексте.

Реакция президента на это выступление была молниеносной — его указом Алиев был лишен всех должностей, полиция объявила его в розыск. Разочарование в связи с приостановкой деятельности "Каравана" и КТК выразило Посольство США в Казахстане.

ЛЮБОПЫТНО

Хотите поужинать с министром?

Бывший президент Южно-Африканской Республики 89-летний Нельсон Мандела через открытый интернет-аукцион Ebay предложил составить ему компанию в так называемом "раннем плотном ужине с чаем", сообщает издание The Inquirer.

Встреча с победителем торгов состоится в штаб-квартире Детского фонда Нельсона Манделы, расположенной в столице ЮАР — Йоханнесбурге. Туда участник аукциона, пожелавший отужинать со всемирно известным африканским политическим деятелем и готовый заплатить за это больше остальных, должен будет добраться сам.

Вырученные средства экс-президент ЮАР планирует потратить на благотворительные программы для детских учреждений Южной Африки. В ноябре 2006 года Мандела уже выставлял на торги в Ebay возможность выпить с ним чаю.

